ТВ тыдзень

№ 1 (359) 9 студзеня 2003 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

НАГОДЫ году

**Палітыкі на ростанях**
Лабановіч прапануе падтрымаць Лукашэнку.
старонка 3

**Скарб Радзівілаў**
За што Антоні Радзівіл, XIV ардынат Нясьвіскі, паставіў Марыі дэ Кастэлян помнік пры жыццы.
старонка 11

**Фітнэс**
у Купалавым садзе.
старонка 2

**Нью-Ёрку грозім кулаком**
Ура, ура — патопім ў соплях...
старонка 7

# Anno Domini 2004



КАЛЯЖ АРЦЁМА ЛЯВЫ

**Батлейка**
**Старонка 14.**

## Эўразьвяз пагражае санкцыямі

**Беларусь згубіць усе льготы ў гандлі з краінамі ЭЗ, калі спэцыяльнае расьсьледаваньне Эўракамісіі выявіць, што ў нашай краіне парушаюцца правы работнікаў падчас прыёму на працу.** Сыстэма гандлёвых льготаў прадугледжвае зьніжаныя імпартныя пошліны на ўвоз тавараў у Эўропу. У выніку іх скасаваньня Беларусь можа страціць 100 млн эўра штогод.

## Папа незадаволены ААН

**Ян Павал II лічыць, што ААН сваё аджыла.** 1 студзеня, падчас казані, прысьвечанай Сусьветнаму дню міру, ён раскрытыкаваў ААН. Арганізацыя ня здольная супрацьстаяць войнам. Апроч таго, ААН, МВФ і Сусьветны Банк «не спрыяюць салідарнасьці між багатымі й беднымі краінамі, абмену рэсурсамі й вынікамі НТП». Пантыфік заклікаў да «новага сусьветнага парадку», які можа выявіцца ў замене ААН іншай структурай.

## Фронт абароны барадачоў

**Кіраўніцтва нафтавай кампаніі «Exxon-Mobil» забараніла сваім супрацоўнікам мець бароды й бакенбарды.** Маўляў, расьліннасьць на твары замінае ахоўным маскам гермэтычна прылягаць. «Пасьлядоўнікі» Кастра ды Элвіса ў кампаніі ў адказ стварылі фронт абароны бародаў ды зьбіраюцца змагацца за свае правы.

# Памажы сабе сам

— Васечка, прачынайся, ня порці настраеніе людзям,— спрабуе раскатурхаць вахцёрка мясцовага апівоху. Але той не сьпяшаецца пралупіць вочы. На казённым скураным заслончыку ў атачэньні бялюткага эўрарамонту яму звычна і ўлежна. Не замінае ані чарга ўздоўж сьценаў, ані цяжкі, абы-як прымацаваны стэнд «Служба занятости информирует».

— Уставай па-харошаму, каб мне снова нарад не вызываць, — не супакойваецца вахцёрка і з папрокам кідае ў бок чаргі: — Чаму мне не паможаце?

Дарэмна. У адказ — цішыня. Самыя абыякавыя чэргі ў Магілёве менавіта ў Рэгіянальным цэнтры занятасьці (РЦЗ). Размаўляць няма пра што. Пахваліцца няма чым. Скардзіцца бессэнсоўна, як і даваць парады такому ж бедаку, як сам. Вось і сядзяць моўчкі па дзьве-тры гадзіны.

Апівоха нарэшце ўспароўся і няцьвёрдым крокам пасунуўся да выхаду. Але аўтычная чарга на ягонае цудоўнае абуджэньне не зьвярнула аніякай увагі. У кожнага сваё гора.

**Карэспандэнтка «НН» пабыла ў скуры беспрацоўнае. Старонка 4.**


PHOTO BYMEDIA.NET

**Апошнія сем гадоў незадаволеныя станам справаў у краіне ня мелі парлямэнцкай трыбуны.**

# Год выбараў

Беларусь уступіла ў новы год — год выбараў, якія цяжка назваць парлямэнцкімі, але значэньне якіх немагчыма пераацаніць. Калі ў 2000 г. дэмакратычная апазыцыя падгадала з байкотам, дык на пачатку новага стагодзьдзя настроі ў грамадзтве зьмяніліся. І 2003 год — год выбараў у мясцовыя органы ўлады — паказаў гэта. Аматары пэрманэнтнага байкоту, якія на прэзыдэнцкіх выбарах ня здолелі сабраць 100 тыс. подпісаў за свайго правадыра, могуць цьвердзіць пра нелегітымнасьць «парлямэнту» і яго бясправаўе, але іншага выбарнага органу нацыянальнага маштабу ў нас няма. Значыць, і альтэрнатывы выбарам няма (ня будзем жа мы сур'ёзна разглядаць магчымасьць рэвалюцыі).

2004 год ёсьць пачаткам палітычнага цыклу, які мае завяршыцца ў верасьні 2006 г. прэзыдэнцкімі выбарамі.

З 1992 г. дэмакратыя ў Беларусі цярпіць паразу за паразаю. І віна за гэта кладзецца на «правадыроў», якіх турбавалі і турбуюць у першую чаргу не інтарэсы дэмакратыі, а іх пэрсанальнае месца ў дэмакратычным руху, «крэсла», «партфэль», доступ да рэсурсаў.

У 2003 г. дэмакратычныя партыі дасягнулі маленькага посьпеху на мясцовых выбарах. Ці азначае гэта паварот да лепшага? Аптымісты сьцьвярджаюць — так. Пэсымісты ў гэтым ня ўпэўненыя. Але і тыя, і другія згодныя ў адным: ад таго, як будуць складацца справы ў 2004 г., шмат у чым будзе залежаць вынік выбарчае кампаніі 2006 г.

Калі аптымісты кажуць пра зьмены ў настроях грамадзянаў, дык пэсымісты паказваюць на тое, што на чале дэмруху стаяць асобы, якія ўпэўнена вялі яго ад паразы да паразы, што дэмпартыі хварэюць на невылечныя, як здаецца, хваробы і няздольныя да абнаўленьня.

Для дэмакратычнага руху, як і раней, актуальнымі застаюцца пытаньні: ці будуць унутрыпартыйныя «разборкі» па-ранейшаму першачарговаю справаю? Ці будзе міжпартыйная канкурэнцыя, як і раней, на другім пляне? Ці па-ранейшаму адзінства дзеяньняў дэмакратычных сілаў заставацьмецца трэцяраднымі клопатам? Вось пытаньні, на якія адкажа год 2004.

Дагэтуль у Беларусі існавала дзіўная практыка: партыя прайграе выбары, а яе старшыня застаецца на пасадзе або раскалвае партыю, каб утрымаць «партфэль».

Ня выключана, што 2004 г. пакладзе канец гэтай недэмакратычнай практыцы. Ва ўсякім разе, гэты год будзе выпрабаваньнем для партыяў і на іх дэмакратычнасьць.

**Анатоль Сідарэвіч**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**У вёсцы Дружная на Нарачы, заселенай чарнобыльцамі, на нямецкія грошы збудаваныя экалягічна чыстыя, уцепленыя чаротам дамы. Электрычнасьць для вёскі выпрацоўваюць збудаваныя немцамі ветраэлектрастанцыі.**

# Традыцыйныя нетрадыцыйныя

Урад пастанавіў №1699 падоўжыў тэрмін рэалізацыі Праграмы павелічэньня выкарыстаньня мясцовых відаў паліва і нетрадыцыйных крыніцаў энэргіі да 2010 г. Раней разьлічвалася, што праграма завяршыцца ў 2005 г.

У 2003 г. аб'ём выкарыстаньня мясцовых відаў паліва дасягнуў прыкладна 5,5 млн умоўных тон. Праграмай заплянавана, што ў 2010 г. гэты паказчык дасягне 6,5—7 млн тон. У яго структуры нафта і спадарожны газ складуць 2,5 млн, біямаса — 2,6 млн, паліўны торф і брыкет — 1,1 млн, нетрадыцыйныя віды энэргіі і другасныя энэргарэсурсы — 0,3 і 0,5 млн. тон адпаведна.

Іронія лёсу ў тым, што нетрадыцыйнымі крыніцамі энэргіі цяпер завуцца якраз найбольш традыцыйныя для нашай краіны крыніцы. Стагодзьдзямі на Беларусі існавалі млыны, што выкарыстоўвалі энэргію ветру і вады. Да 60-х у краіне функцыянавалі дзясяткі малых гідраэлектрастанцыяў, кацельні працавалі на дровах і торфе. Калі ж энэрга- і цеплаэнэргасыстэмы «цэнтралізавалі», Беларусь апынулася ў залежнасьці ад імпарту энэрганосьбітаў з Расеі. Наколькі небясьпечна гэта для эканамічнай і палітычнай незалежнасьці краіны, шмат гаварылася яшчэ ў пачатку 90-х.

Але толькі аднядаўна ў Бабруйску адчынены першы завод для вырабу паліва з пілавіньня, якое раней спальвалі. Пачалося і аднаўленьне электрастанцыяў на малых рэках. У выпадку рэалізацыі праграмы ў 2010-м Беларусь будзе сярод эўрапейскіх лідэраў па выкарыстаньні альтэрнатыўных крыніцаў энэргіі.

**Дамінік Міхайловіч**

НЕ БЯЗ НАС

# У адзін дзень з БССР і Кубай

Сёлета Рэспубліка Гаіці, адна з найбяднейшых краінаў сьвету, адзначыла 200-годзьдзе сваёй незалежнасьці. 1 студзеня 1804 г. на далёкім востраве Санта-Дамінга перамагло паўстаньне чорных рабоў. Гэтая навіна актыўна абмяркоўвалася і ў Беларусі. Аб падзеях на Санта-Дамінга згадвалі Міцкевіч, Булгарын, Крашэўскі.

Прычыны былі дзьве. Па-першае, многіх паноў хвалявала, ці ня здольныя паўтарыць рабункі далёкіх мурынаў уласныя хлопы. Па-другое, у віры падзеяў апынуліся ліцьвіны зь легіёнаў Касьцюшкі. Напалеон паслаў іх на ўтаймаваньне бунтоўнай выспы. Але дарэмна ён так зрабіў. Менавіта капітуляцыя легіянэраў перадвызначыла перамогу інсургентаў. Была гэта салідарнасьць прыгнечаных нацыяў або звычайны клопат аб сваёй скуры — цяжка сказаць. У любым выпадку мы можам ганарыцца ўнёскам нашых продкаў у справу свабоды гаіцянскага народу.

**УШ**



ЛЕВЫМ ВОКАМ

# Гуд бай, Зюганаў



Уявіце, што дарэвалюцыйная «Правда» друкуе рэпартаж з распуцінскай оргіі ў «Асторыі» пад рубрыкай «Сьвет забаваў» побач з матэрыялам «Аб расстрэле на Ленскіх капальнях».

Адзін з самых цікавых вынікаў году: адкінуў капыты замшэлы дыскурс беларускіх левых, сутнасьць якога ілюстраваў тэлефонны маналёг: «Алё, Смольны... Гэта зь Менску турбуюць… Не зь Мінусінску, а зь Менску... Ваша дырэктыва выканана. Так. Чакаем новых інструкцый...»

Пазбыўшыся тубыльскага комплексу (яго хутка прыкарманілі лібэралы), нашыя левыя апынуліся на этычным бязрыб'і. У лібэралаў этас просты: зарабляй болей ды бухай, у нацыяналістаў — размаўляй на мове і бухай, а што ў левых? Ёсьць эўрапейская левая традыцыя, якую трэба адаптаваць. Але эўрапеізацыя нашых левых нагадвае прафанацыю. У бухвостаўскай «Салідарнасьці» сьлезацечны артыкул аб лёсе працоўнага дзеліць плошчу з рэпартажам аб конкурсе бармэнаў з фэшэнэбэльнага «Мэдысан-клюбу». Уявіце, што дарэвалюцыйная «Правда» друкуе рэпартаж з распуцінскай оргіі ў «Асторыі» пад рубрыкай «Сьвет забаваў» побач з матэрыялам «Аб расстрэле на Ленскіх капальнях».

Або вось на тым тыдні ў Берасьці было канфіскавана 20 кг марыхуаны. На Захадзе, дзе нават лейбарысты, ня кажучы пра камуністаў і зялёных, выступаюць за легалізацыю лёгкіх наркотыкаў, навіна выклікала б гарачую дыскусію. Але «главная задача партийной работы текущего момента — проведение подписной кампании», — глаголе сьвежы «Товарищ».

Не заклікаю Калякіна з Бухвостаўым ды Шушкевічам абкурвацца чуйкай да зялёных лукашэнкаў. Хацеў бы, каб мы мелі сапраўды эўрапейскую левіцу. Каб беларускіх левых не ўганяла ў фарбу візіты парыскага мэра, сацыяліста Дэлянаэ: «Бэртран Дэлянаэ, для сяброў проста Брыджыта». Каб левыя партыі існавалі не за кошт сацыяльнай дэмагогіі і саўковай настальгіі, а былі філіямі эўрапейскага праекту, які з часоў Лукача будуецца на татальнай антыкапіталістычнай мадэлі суб'ектнасьці.

Натуральна, Вы глядзелі гіт сэзону, фільм Вольфганга Бэкера «Гуд бай, Ленін!» аб фанатычнай камуністцы, якая ўпала ў кому напярэдадні падзеньня бэрлінскай сьцяны і выйшла зь яе пры капіталізьме. Сын вырашыў не шакаваць маму і старанна стварае для яе ўражаньне, што ГДР усё яшчэ існуе.

У беларускім рэмэйку бэкераўскай стужкі ў 20.. годзе, пры чарговай папулісцкай дэспатыі, сын будзе падсоўваць маці нават не артыкул «Вячорка — байструк Кубэ» і не радыёінтэрвію з Калякіным, які выступае супраць парлямэнцкага крэтынізму. Сыну дастаткова будзе выйсьці на вуліцу і набыць «Товарищ» з прагонам аб тым, што «главная задача партийной работы текущего момента — проведение подписной кампании».

**Лёлік Ушкін,**
левы тусоўшчык

СКАНДАЛ

# Фітнэс у Купалавым садзе

**Дом, у якім жыла Купалава сям'я, зьбіраюцца разбурыць, каб збудаваць звычайны шматпавярховік.**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

У гэтай двухпавярховай камяніцы на вул.Румянцава, 7, насупраць амбасады Польскай Рэспублікі, дажывала век Уладзіслава Францаўна. Тут бывалі Янка Брыль, Валянцін Таўлай, Сьцяпан Александровіч. Тут задумляўся і ствараўся музэй Янкі Купалы.

У 2002 г. будынак набыло СП «Група МБЛ-Бел». Прычым сам ён новага ўласьніка не цікавіў. «Нам патрэбны пляц», — заяўлялі кіраўнікі фірмы. Быў распрацаваны праект будаўніцтва на тым пляцы новага шматкватэрнага дому з падземнай аўтастаянкай і фітнэс-цэнтрам.

Першымі ў абарону будынку Купалавай сям'і выступілі суседзі — жыхары навакольных дамоў. У сакавіку 2003 г. яны накіравалі калектыўныя звароты на імя тагачаснага галоўнага архітэктара Менску А.Чадовіча. Быў зварот і ад дэпутата Анатоля Красуцкага. А тым часам Дэпартамент па ахове гісторыка-культурнай спадчыны даў дабро на знос будынку. «Гэта не музэй — звычайнае жыльлё, — камэнтаваў дырэктар Дэпартамэнту В.Абламскі.

Працяг на старонцы 10.

**«Я перакананы, што з расейскім рэжымам нам можа быць нашмат горш, — кажа Лабановіч. — Дакладней, значна безвыходней. Можа быць так, што мы ўжо нічога вырашаць ня будзем. Так што ў пытаньні абароны сувэрэнітэту Беларусі перад крамлёўскай пагрозай мы як апазыцыя павінны Лукашэнку падтрымаць. Магчыма, перад абліччам новых выклікаў нам трэба перагледзець сваё стаўленьне да Лукашэнкі, а можа быць, нават шукаць шляхі збліжэньня зь цяперашняй уладай». На думку Лабановіча, «пападаньне Лукашэнкі між кавадлам і молатам Усходу й Захаду прывядзе не да падзеньня рэжыму, а да падзеньня Беларусі пад ударам усходняга молата».**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Прапанова Лабановіча

## Паўгоду працы ў Расеі хапіла, каб лідэр АГП падтрымаў Лукашэнку

Спрэчкі вакол стаўленьня апазыцыйных сілаў да канфлікту Пуціна й Лукашэнкі вядуцца столькі, колькі існуе гэты канфлікт. Сёлета, пасьля прадказальных прэзыдэнцкіх выбараў у Расеі, магчымы працяг «расейска-беларускай інтэграцыйнай дыскусіі» з усімі наступствамі. Апазыцыя апынецца на чарговых ростанях: падтрымаць свой, няхай і аўтарытарны рэжым альбо паспрабаваць прыйсьці да ўлады з дапамогай Масквы.

30 сьнежня ў «Народнай волі» зьявілася інтэрвію зь Яўгенам Лабановічам, кіраўніком менскай гарадзкой арганізацыі АГП. Паўгоду ён стажаваўся ў Цюмені ў выбарчым штабе аднаго з кандыдатаў у дэпутаты Дзяржадумы. Лабановіч называе сытуацыю ў Расеі пасьля парлямэнцкіх выбараў «фатальнай». На ягоную думку, Расея стала «на лацінаамэрыканскі шлях разьвіцьця», а расейцы гатовыя галасаваць «за нацыцкую ідэю».

Упершыню палітык такога высокага ўзроўню з «Народнае кааліцыі 5+» адкрыта заявіў: «Лепш Лукашэнка, чым Расея».

Пакуль думку палітыка з АГП падзяляе толькі **Мікола Статкевіч**. На думку старшыні БСДП (НГ), да ўлады варта ставіцца прагматычна і пасьлядоўна. «Калі ёсьць супадзеньні ў праграмах, трэба падтрымліваць уладу. Калі ёсьць разыходжаньні, трэба ўладу крытыкаваць», — кажа Статкевіч.

«Гэта няправільны падыход, — не пагаджаецца дэпутат палаты прадстаўнікоў **Уладзімер Парфяновіч**. — Незалежнасьць — адна справа, а Лукашэнка — другая. Гэта проста брудная палітыка».

«Калі Лукашэнка ня створыць мэханізмаў абароны незалежнасьці Беларусі, мы яго здымем з пасады і прывядзём Беларусь да сапраўднай незалежнасьці», — кажа **Павал Севярынец**. Але на вуліцу з плякатамі ў падтрымку Лукашэнкі ён выходзіць не зьбіраецца, пакуль улада ня зробіць канкрэтных крокаў па беларусізацыі краіны, пакуль ня будзе раскрытая праўда пра зьніклых палітыкаў і г.д. Дый Севярынец ня верыць, што Лукашэнка гэта зробіць.

Катэгарычна супраць падтрымкі ўлады выступае кіраўнік Беларускай партыі працы **Аляксандар Бухвостаў**. «Ні ў якім разе! Я не прымаю дыктатуры ні ў якім выглядзе, а тым больш дыктатуры ў нашай краіне, — кажа Бухвостаў. — І ня бачу такой пагрозы, якая б прывяла да згубы незалежнасьці Беларусі. Калі будзе пры ўладзе Лукашэнка, мы хутчэй згубім яе, чым безь яго».

Ня бачыць такой пагрозы і намесьнік старшыні Партыі БНФ **Аляксей Янукевіч**: «Апазыцыя ні ў якім разе ня можа падтрымаць спадара Лукашэнку, бо ён змагаецца не за незалежнасьць Беларусі, а за сувэрэнітэт сваёй улады». Калі Лукашэнка «здолее абараніцца ад Пуціна, гэта не прынясе карысьці Беларусі», — лічыць Янукевіч. Хоць і прызнае, што некаторыя дзеяньні Лукашэнкі могуць быць карыснымі, але «гэта ня значыць, што мы яго павінны падтрымліваць».

Адзін зь лідэраў Эўрапейскай кааліцыі «Свабодная Беларусь» **Зьміцер Бародка** ня верыць Лукашэнку. «Яго цікавяць найперш асабістыя інтарэсы. Таму ў любой сытуацыі Лукашэнку нельга падтрымліваць».

Дэпутат Жлобінскага гарсавету **Марат Афанасьеў** (АГП) кажа, што ў нечым згодны з думкай Лабановіча, хоць і не ва ўсім яго падтрымлівае. Ён, напрыклад, зьвяртае ўвагу на адсутнасьць зьменаў у палітыцы Лукашэнкі. «Колькі летась гаварылі пра лібэралізацыю эканомікі, а яе не адбылося», — кажа Афанасьеў.

Слушна адзначана Лабановічам, што Лукашэнка ў дапамозе апазыцыі ня мае патрэбы. Пакуль, прынамсі. Затое сама апазыцыя мае патрэбу ў падтрымцы грамадзтва. Словы Лабановіча ня варта інтэрпрэтаваць як своеасаблівую «капітуляцыю перад рэжымам». Лабановіч ня мае ілюзій, што Лукашэнка падзеліцца ўладай з праэўрапейскімі палітыкамі: «Толькі тады Лукашэнка будзе з намі размаўляць, калі мы будзем моцныя ўнутры краіны». Лабановіч агучыў тое, што даўно думалі тысячы выбарцаў і сотні актывістаў апазыцыі. Лабановіч настойвае, што апазыцыі сьлед падтрымаць Лукашэнку, падай ён «заяўку на ўступленьне ў Эўразьвяз».

Трэба аддаць належнае апазыцыі. За папярэднія два гады ў ёй не знайшлося аматараў абараняць расейскія інтарэсы. Многія беларускія палітыкі сабе думаюць тое, пра што адкрыта заявіў Зянон Пазьняк у апошнім інтэрвію «НН»: «Калі ўявіць, што расейцам пры дапамозе «апазыцыі» ўдасца забраць Беларусь, то гэтая апазыцыя будзе таксама ліквідаваная імі, разам з Лукашэнкам».

Відавочна: узьнятая Лабановічам праблема стане прадметам дыскусіі ў апазыцыйных колах. З выказваньняў Лабановіча відаць, што пакуль у апазыцыі вядзецца гаворка толькі пра магчымую падтрымку Лукашэнкі ў пытаньні незалежнасьці, але не ў эканамічных ці палітычных пытаньнях. Аднак стала ясна таксама, што некаторым прадстаўнікам апазыцыі будзе дастаткова шэрагу крокаў Лукашэнкі ў кірунку эўраінтэграцыі, каб падтрымаць яго. Характэрна, што першым пра гэта загаварыў прадстаўнік лібэральнай партыі, якая вызначалася добрымі кантактамі з расейскім Саюзам правых сілаў.

**Алег Тачоны**

# Зьезд

БСДГ чакаецца зноў


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

11 студзеня ў Менску пройдзе чарговы зьезд Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады зь перавыбарамі кіраўніцтва. Зьезд, з розных прычынаў, неаднаразова адкладаўся. Адбывалася гэта на фоне непаразуменьняў між прыхільнікамі Станіслава Шушкевіча і Аляксея Караля. Гарачыя спрэчкі на зьезьдзе могуць разгарэцца вакол выключэньня з БСДГ 62 «каралёўцаў» у Горадні. Аднак ніякіх расколаў не чакаецца, бакі настроеныя на мірнае ўрэгуляваньне сытуацыі.

# Прэзэнтацыя

без фуршэту



PHOTO.BYMEDIA.NET

19 студзеня ў канфэрэнц-залі Міжнароднага адукацыйнага цэнтру ў Менску адбудзецца прэзэнтацыя «Народнай кааліцыі 5+». У праграме мерапрыемства запланаваныя выступы лідэраў, падпісаньне сумеснай дамовы і прэзэнтацыя адзінага сьпісу кандыдатаў на выбары ў палату прадстаўнікоў. Фуршэту пасьля мерапрыемства не прадугледжана. «Гэта прынцыповае рашэньне партыйных лідэраў. Каб не казалі, што на чарговую тусоўку сабраліся», — кажа кіраўнік прэс-службы «Пяцёркі» Павал Уладзіміраў.

# Мільён

улётак «Свабоднай Беларусі»


PHOTO.BYMEDIA

Эўрапейская кааліцыя «Свабодная Беларусь» распачала сваю рэклямную кампанію. «Мы хочам разам з Вамі прывесьці нашую краіну ў адзіную Эўропу, каб людзі ў Беларусі жылі годна», — гаворыцца ва ўлётцы — віншаваньні з Калядамі. Як сьцьвярджаюць «эўрапейцы», было раскідана 960 тысяч асобнікаў.

# Падатковая

зацікавілася Навасядам


PHOTO.BYMEDIA.NET

У першай палове студзеня стане вядома, ці будзе зарэгістраваная Партыя свабоды і прагрэсу (ПСП).

Ва ўстаноўчым зьезьдзе, што прайшоў у лістападзе 2003-га, узялі ўдзел 99 дэлегатаў, пераважна сябры грамадзкай арганізацыі «Грамадзянскі форум». Старшынём ПСП быў абраны дэпутат палаты прадстаўнікоў Уладзімер Навасяд. Паводле словаў У.Навасяда, у першай палове студзеня адбудзецца пасяджаньне камісіі па рэгістрацыі і перарэгістрацыі палітычных партыяў і грамадзкіх аб'яднаньняў, якая і вырашыць лёс ПСП. А пакуль чыноўнікі апытваюць удзельнікаў установага зьезду ды падатковая інспэкцыя правярае дзейнасьць «Грамадзянскага форуму».

Цікава, што ў нашай краіне ўжо дзесяць гадоў дзейнічае незарэгістраваная правая Беларуская партыя свабоды. Навасяд жа будуе лібэральную партыю, таму некаторыя бачаць мэту яго праекту ў стварэньні канкурэнцыі апазыцыйнай АГП.

**АТ**

# Памажы сабе сам

## Інжынэр, веданьне замежных моваў, ПЭВМ. Заробак — 79000 руб.

Працяг са старонкі 2.

### «Ужо ўзялі»

Панядзелак. Сьвежыя сьпісы вакансіяў толькі зьявіліся на дошцы аб'яваў. Вакол натоўп, ня ўбіцца. Азнаёміўшыся, пераконваешся — мала што зь мінулага тыдня зьмянілася.

Вартаўнік (даглядчык жывёлы) — заробак 77000 руб.

Прыгарадныя білеты падаражэлі, грошы ў калгасе плацяць рэдка. Нават на праезд да той фэрмы наўрад ці заробіш.

Інжынэр, досьвед працы, веданьне замежных моваў, ПЭВМ. Заробак — 79000 руб.

Сьмех і гора! Хоць на турэцкага султана вучыся! Хочаце атрымаць зьвесткі пра самыя непэрспэктыўныя прадпрыемствы і пасады — угледзьцеся ў сьпісы. Калі абвестка завісае тут месяцамі ці зьяўляецца некалькі разоў на працягу году, ведай — альбо малы і нерэгулярны заробак, альбо аддаленасьць ад гораду, цяжкія ўмовы працы. Найчасьцей гэта ўсё спалучаецца разам. Вясковыя ФАПы, ДК, крамы, калгасы і саўгасы раёну, зьверафэрма, фабрыка мастацкіх вырабаў. Апошнім часам тут жа, у будынку РЦЗ, спрабуюць вэрбаваць беспрацоўных прадстаўнікі сеткавага маркетынгу. Але вялікага посьпеху ня маюць нават сярод такой аўдыторыі.

Пабачыўшы вакансію з заробкам, вышэйшым за 120000 руб., ды яшчэ ў сфэры культуры або адукацыі, асабліва ня радуйцеся. Хутчэй за ўсё, патэлефанаваўшы, пачуеце: «Ужо ўзялі».

І гэта ўсяго праз гадзіну-дзьве пасьля таго, як абнавілі інфармацыю. Кожная ўстанова мусіць падаваць зьвесткі ў РЦЗ. Інакш юрысты цэнтру могуць аштрафаваць кіраўніцтва. Вось і падаюць, а на працу бяруць усё роўна сваіх знаёмых. Шанец хоць неяк уладкавацца з дапамогаю службы занятасьці маюць хіба мужчыны з будаўнічымі спэцыяльнасьцямі.

### З навукі хлеба ня мецьмеш

У аддзеле прафарыентацыі прапанавалі перавучыцца, азнаёміўшы з даўжэзным пералікам курсаў. А пры далейшай гутарцы высьветлілася: па большасьці прапанаваных прафэсіяў працаўладкавацца цяжка.




PHOTO.BYMEDIA.NET

**У Менску лягчэй за ўсё знайсьці працу праграмістам. Трошкі менш вакансій фірмы прапануюць для мэнэджэраў па пэрсанале, мэнэджэраў па продажах, маркетынгу і рэкляме, галоўных бухгальтараў і бухгальтараў. Безьліч вакансій прапануюць сеткавыя структуры накшталт «Цяньшы» (біядабаўкі) альбо «NSP» (натуральная касмэтыка). Праца для беларускіх рознарабочых і будаўнікоў ёсьць у Расеі ды Ізраілі. Па-за гэтым трапляюцца асобныя прапановы для дызайнэраў, сакратароў, інжынэраў, экспэдытараў і перакладчыкаў. Пры канцы 2003-га ўзровень беспрацоўя па Магілёўскай вобласьці склаў 3,7%. Агулам па краіне — 3,1%. Больш за ўсё беспрацоўных на Віцебшчыне (4,3%). Партрэт тыповага беспрацоўнага — жанчына 30 гадоў зь сярэдняй ці сярэдняй спэцыяльнай адукацыяй.**

Курсы існуюць у асноўным для дзяўчынак і хлопцыкаў, а дарослае насельніцтва прымаюць толькі па накіраваньнях.

Пачуўшы такое, пачынаеш сумнявацца, ці не зьяўляецца служба занятасьці філіяй палацу дзіцячай творчасьці. Дарэчы, прафарыентацыйную функцыю РЦЗ выконвае добра. Тэсты, анкеты, гутаркі з псыхолягамі. Толькі ці ёсьць у гэтым вялікая неабходнасьць, калі асноўную ролю адыгрывае блат, а не ўсялякія там схільнасьці-здольнасьці. Дый, сумленна кажучы, абраная прафэсія недаспадобы найчасьцей у адным выпадку: плацяць мала, патрабуюць зашмат.

### Паншчына ў законе

Што самае непрыемнае ў жыцьці беспрацоўнага? Вядома, грамадзкія работы. Іх трэба адрабляць двойчы на месяц. Увосень — удзельнічаць у самай малааплатнай сельгаспрацы, узімку — прыбіраць гарадзкія вуліцы. Вам кажуць — такім чынам можна зарабіць неблагія грошы? Плюньце ў вочы! Абяцанка-цацанка, а дурню радасьць. Як пераканацца? Адгукніцеся восеньню на адну з прапаноў кшталту: «Рэгіянальны цэнтар занятасьці запрашае беспрацоўных і незанятае насельніцтва ўзяць удзел ва ўборцы льну. Разьлік штодня».

Золкаю раніцай сядаеце ў службовы аўтобус, прыяжджаеце ў калгас недалёка ад Дрыбіна. А там вам паведамляюць:

— Лён сёньня будзем не вязаць, а падымаць. Гэта каштуе 90 рублёў за сотку.

Чуюцца воклічы:

— У кіно я такую работу бачыў!

Жаданьня ехаць сюды яшчэ раз ні ў кога няма. І тут зьяўляецца яшчэ адна акалічнасьць. Разьлік будзе заўтра пры канцы дня, адзнакі аб адпрацоўцы работ — таксама.

У выпадку, калі вы не атрымліваеце дапамогі па беспрацоўі, лепей за ўсё адразу пайсьці па грыбы ў бліжэйшы лес. Прынамсі, матэрыяльна выгадней, маральна спакайней і на дарэмным праезьдзе эканомія.

> Гандаль працоўнымі месцамі на дзяржпрадпрыемствах у Магілёве ні для кога не таямніца. За станоўчае вырашэньне пытаньня і па 500 даляраў бяруць.

### Зьніжайце самаацэнку

«Колькі беспрацоўных зарэгістравана ў Магілёве?» — пытаюся ў супрацоўнікаў РЦЗ. Вынік аднолькавы. Напачатку — зьдзіўленьне: «А вам навошта?» Потым — цьвёрдая перакананасьць: «Ну, гэта вам проста так ніхто ня скажа». Паўсюль рэжым строгай засакрэчанасьці. Відаць, учора тэлефанаваў нейкі замежны шпіён і паграўжаў скрасьці ўсіх магілёўскіх беспрацоўных.

Выпадкова натрапіла на зьвесткі пачатку лістапада. Тады беспрацоўных налічвалася 6500 чалавек. І гэта толькі афіцыйныя лічбы, бо рэгіструецца далёка ня кожны.

Пра падвышэньне ўзроўню беспрацоўя яскрава сьведчаць чэргі як у кабінэт першаснай рэгістрацыі, так і на прыём да спэцыялістаў па працаўладкаваньні. У студзені чакаюцца далейшыя скарачэньні на прадпрыемствах, у мэдустановах.

Варта адзначыць — за апошнія два-тры гады кантынгент кліентаў РЦЗ зьмяніўся. Раней пераважалі асацыяльныя асобы ды падлеткі-гультаі, цяпер — прыстойныя, акхайна апранутыя людзі без мацюкоў у размове. Колькасная перавага жанчын таксама кідаецца ў вочы без статыстыкі.

Усе разумеюць — знайсьці тут добрую працу малаімаверна. Але патрэбны стаж, даведка ў службу субсыдый, а грашовая дапамога, хай сабе і мізэрная, лішняй ня будзе. Некаторыя часова падрабляюць у прыватнікаў без працоўнай кніжкі, бо на 20—30 тысячаў не пражывеш, а застацца бяз пэнсіі ня хочацца.

Я ні ў якім разе ня маю намеру пакрыўдзіць шараговых супрацоўнікаў службы занятасьці. Свае 120—150 тыс. яны адпрацоўваюць зь лішкам. Бяскрыўдныя, ветлівыя жанчыны. Нават з апівохамі ўмеюць абысьціся па-сваяцку спагадліва. Суцешаць, цярпліва растлумачаць, даведку ў тэрмін выпішуць, аформяць стэнд з парадамі замежных псыхолягаў па пошуку працы. А калі парады тыя да магілёўскай рэчаіснасьці ня маюць дачыненьня — віна ня іхняя.

Гандаль працоўнымі месцамі ні для кога ў горадзе даўно ўжо не таямніца. Бывае, за станоўчае вырашэньне пытаньня ажно па 500 даляраў бяруць. Славутая кантрактная сыстэма ўдала гэтаму спрыяе.

У такіх умовах служба занятасьці зьяўляецца ўсяго толькі закладніцай. Яе кіраўніцтву нічога не застаецца, як вымушана не заўважаць сытуацыі і тлумачыць у мясцовых СМІ цяжкасьці з працаўладкаваньнем недахопамі ў прафарыентацыі школьнікаў ды завышанай самаацэнкай насельніцтва.

Вось як! Жадаеце нешта зьмяніць навокал — пачніце зь сябе. Няўхільна зьніжайце самаацэнку. Спачатку пагадзіцеся працаваць бясплатна, пасьля паступова есьці адвыкнеце. І ня будзе тады ў Беларусі ані беспрацоўных, ані галодных.

**Тацяна Барысік, Магілёў**

**На фота ўверсе: магіляўчане спрабуюць знайсьці працу на кірмашы вакансій у рэгіянальным цэнтры занятасьці.**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Беспрацоўныя жыхары Барысава сёлета ўвосені зараблялі на жыцьцё зборам капусты ў калгасе «Маяк». Заробак — 30 кіляў зялёнае царыцы палёў за дзень.**

# Лукашэнка ўзмацняе кантроль над ВПК

Напярэдадні Новага году Аляксандар Лукашэнка стварыў Дзяржаўны вайскова-прамысловы камітэт (ДВПК), які павінен кантраляваць працу ўсіх абаронных прадпрыемстваў краіны. Задачы камітэту — правядзеньне адзінай дзяржаўнай палітыкі ў галіне абароны, разьвіцьцё абароннага сэктару эканомікі і вайскова-прамысловага супрацоўніцтва, паведамляе прэзыдэнцкая прэс-служба. Істотны нюанс: ДВПК перадаюцца «некаторыя функцыі ў сыстэме экспартнага кантролю».

За некалькі тыдняў да афіцыйнай заявы пра стварэньне камітэту экспэрты расейскай «Независимой газеты» тлумачылі гэты крок «пэрспэктывамі павелічэньня паставак беларускай зброі за мяжу». І зьвязвалі гэтыя пэрспэктывы зь візытам Лукашэнкі ў Сырыю.

Каб захаваць ды павялічыць сёньняшнія прыбыткі ад продажу зброі за мяжу, усталяваць абсалютны кантроль над фінансавымі патокамі, і ствараецца ДВПК. У яго склад будзе ўключана каля 70 беларускіх абаронных прадпрыемстваў. Ня толькі дзяржаўных: «пад поўным дзяржаўным кантролем» будуць дзейнічаць і прыватныя прадпрыемствы, якія выпускаюць прадукцыю вайсковага прызначэньня.

Адным зь вядучых дзяржпрадпрыемстваў зьяўляецца навукова-вытворчае аб’яднаньне «Агат». На ім ствараюцца і праходзяць выпрабаваньні найноўшыя лічбавыя сыстэмы сувязі для Ўзброеных Сілаў. «Агат» таксама распрацоўвае комплекс сродкаў аўтаматызацыі для падразьдзяленьняў стралкоў-зэнітчыкаў «Шлем», які дазволіць павялічыць баявыя магчымасьці пераноснага зэнітна-ракетнага комплексу «Іголка».

Невыпадкова ДВПК узначаліў генэральны дырэктар «Агату» Мікалай Азаматаў. Ён сябра праўленьня «Белтэхэкспарту», член-карэспандэнт Міжнароднай акадэміі інфарматызацыі і Беларускай інжынэрна-тэхнічнай акадэміі. Азаматаў працаваў генэральным канструктарам па аўтаматызаваных сыстэмах кіраваньня і інфармацыйных тэхналёгіях Міністэрства прамысловасьці. Паводле некаторых зьвестак, Азаматаў і раней меў дачыненьне да экспарту беларускіх узбраеньняў за мяжу. Колькі гадоў таму ён увайшоў у беларуска-віетнамскую камісію па вайскова-тэхнічным супрацоўніцтве, якую ўзначальваў намесьнік міністра абароны генэрал-маёр Пятро Рагажэўскі.

Павал Казлоўскі, былы міністар абароны Беларусі, мяркуе, што ў стварэньні гэтага камітэту няма нічога кепскага. «Сёньня ёсьць сэнс аб’яднаць усе абаронныя прадпрыемствы. Іншая справа, каб гэта не было скіравана на задавальненьне амбіцыяў аднаго чалавека».

Чакаецца, што Дзяржаўны вайскова-прамысловы камітэт стане адным з галоўных пастаўшчыкоў валютных сродкаў у дзяржаўную скарбонку. Гэта таксама палітычна самая ўплывовая галіна прамысловасьці. Таму ня дзіўна, што такую пільную ўвагу надае стварэньню камітэту Аляксандар Лукашэнка. Для беларускага прэзыдэнта гэта пытаньне трываласьці ўлады.

**Алег Тачоны**

У склад Вайскова-прамысловага камітэту будзе ўключана каля 70 беларускіх абаронных прадпрыемстваў. Ня толькі дзяржаўных, але і прыватных.



PHOTO.BYMEDIA.NET

ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА

## Даляр ня вырасьце вышэй за 2390

**Нацбанк прагназуе, што за наступны год курс даляра ня вырасьце вышэй за 2390 руб.** Рост курсу даляра да рубля можа скласьці да 10%. Нацбанк па-ранейшаму мае намер прывязаць курс беларускага рубля да расейскага, пачынаючы з другога паўгодзьдзя 2004 г.

## Узьлёт тыражу «Беларуси сегодня»

**Першы студзеньскі нумар органу Адміністрацыі прэзыдэнта выйшаў накладам 395 тыс. асобнікаў.** Гэта быў суботні выпуск, тыраж на будні складае 330 тыс. Да Новага году тыраж «СБ-БС» быў на 45 тыс. экзэмпляраў меншы. Праўда, у рэгіёнах краіны падпіска на ўрадавыя выданьні застаецца добраахвотна-прымусовай.

## Адноўлены «Лидер»

**Аднавіўся выхад часопісу эканамічнае скіраванасьці «Лидер».** Дзякуючы новым інвэстыцыям, выданьне стартавала паўторна ўжо як двухтыднёвік з накладам 2000 асобнікаў.

## Новая пралка «Атлянту»

**Завод «Атлянт» паставіў на рынак новую мадэль пральнай машыны-аўтамату «Атлянт».** Гэта ўжо чацьвертая мадыфікацыя за год выпуску пралак. Яна забясьпечвае дадатковыя функцыі, у тым ліку зьмену тэмпэратурнага рэжыму падчас мыцьця. Акрамя таго, апарат больш кампактны.

## Брытанцы самыя працавітыя

**Аж 4 млн брытанцаў, 16% ад усіх работнікаў, працуюць больш за 48 гадзінаў у тыдзень.** Брытанія — адзіная краіна Эўразьвязу, дзе за апошняе дзесяцігодзьдзе сярэдні працоўны час работніка падоўжыўся. Прычым каля 1,5 млн брытанцаў працуюць больш за 55 гадзінаў у тыдзень. І гэта яшчэ ня лічачы кіраўнікоў, час працы якіх не лімітаваны. Найменш у Эўропе працуюць французы. Папярэдні сацыялістычны ўрад скараціў нармаваны працоўны тыдзень да 35 гадзінаў.

## Рэкордны рост эўра

**У аўторак за эўра ўпершыню давалі аж 1,28 даляра.** Экспэрты не наважваюцца прагназваць, ці эўра спыніцца на гэтым узроўні, ці працягне свой рост да 1,40 даляра.



## Рэкордная цана золата

**Праз падзеньне курсу даляра да эўра і ены цана золата ў далярах дасягнула рэкорднага за апошнія 15 гадоў узроўню.** У найбліжэйшыя дні яна можа перавысіць 420 даляраў за тройскую унцыю.

## Навіны аўтарынкаў



**На найбуйнейшым амэрыканскім аўтакірмашы ў Дэтройце аўтамабільныя кампаніі вылузваліся са скуры адна перад адной.** «Форд» паказаў сынтэз джыпа і мінівэна «Форд-Фрыстайл» і люксавую мадэль «Форд-500». «General Motors» прэзэнтавала сярэдняй клясы сэдан «Пантыяк-G6» і меншы «Шэўрале-Кабальт». Трэці гігант аўтаіндустрыі, «Крайсьлер», выйшаў з новым лімузынам 300С, скроеным на капыл сэдана С-300 узору 1955 г. А аўтамабілем году ў ЗША назвалі японскую «Таёту-Прыюс 2».

«Даймлер Крайсьлер» мае намер вывесьці на эўрапейскі рынак марку «Додж», якая раней тут не прадавалася. Гэта своеасаблівы рэванш за спад продажаў «Мэрсэдэсаў», якіх летась разышлося толькі 1,22 млн штук. Затое кампанія «BMW» у 2003 г. прадала рэкордную колькасьць машынаў — болей за 1,1 млн.

**МБ; БелаПАН**

З УСЁЙ КРАІНЫ



## Сто гадоў кавальскаму каледжу

**Магілёўскі машынабудаўнічы прафэсійна-тэхнічны каледж (да 2002 г. ПТВ №33 мэталістаў) 20 сьнежня адзначыў стогадовы юбілей.** У далёкім 1903 г. у горадзе на Дняпры на ахвяраваньні багатых амэрыканскіх габрэяў для навучаньня дзетак з малазабясьпечаных сем’яў і сірот пры Талмуд-Торы была адкрытая рамесьніцкая вучэльня. Мела яна тады чатыры цэхі: сьлясарны, такарны, кавальскі і сталярны.

За сто гадоў — 35 тыс. высокакваліфікаваных рабочых. Лічба ўнушальная, падмацаваная рознага кшталту мэдалямі, ордэнамі, дыплёмамі. Сёньня ў каледжы 450 навучэнцаў. Сярод іх габрэяў няма — адбылося пераразьмеркаваньне сацыяльнага рэсурсу. Але ўсе спэцыяльнасьці захаваліся, зьявілася багата новых. Каледж — адзіная ў краіне навучальная ўстанова, дзе вучаць кавалёў. І па ўсім Магілёве можна ўбачыць краткі, агароджы ды брамы, зробленыя навучэнцамі і майстрамі. У якасьці візытоўкі — мэталічныя ружы, вазы, падсьвечнікі, сьвяцільнікі — на любы капрызны густ.

На стогадовы юбілей багатыя амэрыканскія габрэі грошай не даслалі, даючы адміністрацыі магчымасьць выкараскавацца і сьвяткаваць за кошт «пазабюджэткі». З аб’ектыўнай рэальнасьцю не паспрачаешся.

**Алеся Чыж, Магілёў**

## Шыньнікі засталіся без басэйну

**Кіраўніцтва канцэрну «Белнафтахім» з 1 студзеня зачыніла басэйн санаторна-аздараўляльнага комплексу «Шыньнік».** З прычыны нерэнтабэльнасьці. Хоць штомесяц ім карысталася каля 6000 чалавек.

**Віктар Качан, Бабруйск**

## Палачане пачалі год Быкава

**4 студзеня ў бібліятэцы ў мікраpаёне Марыненка адбылася калядная сустрэча полацкіх сяброў ТБМ.** Летась іхную суполку ўзначаліла Лера Сом, якая здолела актывізаваць работу тэбээмаўцаў. Такая сьвяточная імпрэза за гарбатай зь печывам і цукеркамі была арганізаваная ўпершыню. На пачатку сустрэчы парафіяне грэка-каталіцкай грамады прасьпявалі калядныя песьні, а айцец Лявонці распавёў пра хрысьціянскія традыцыі сьвяткаваньня нараджэньня Збавіцеля. Кіраўнік адной з тэбээмаўскіх суполак, начальнік аховы ААТ «Полацак-Шкловалакно» Ўладзімер Яцкевіч паведаміў, што іх суполка плянуе ўвесну наведаць Бычкі, родную вёску Васіля Быкава. А пры канцы сустрэчы актывісты падпісалі зварот да кіраўніцтва Віцебскага аблвыканкаму з прапановамі па ўвекавечваньні памяці Васіля Быкава. 19 чэрвеня беларуская грамадзкасьць будзе адзначаць 80-годзьдзе з дня яго нараджэньня.

**Васіль Кроква, Полацак**

## Карова на экспарт

**Студэнт Горацкай пэдагагічнай вучэльні скраў карову.** Здарэньне адбылося ў вёсцы Старасельле. Жывёліна належала мясцовай фэрме. Яе прырэзалі і разабралі тамсама недалёка. Мяса «прадпрымальнікі» збылі за мяжой — у мястэчку Краснае, што на Смаленшчыне. Утаргаваныя грошы студэнт пусьціў на забавы — набыў піва і цыгарэтаў.

**Ільля Заранок, Горкі**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

ХРОНІКА СУПРАЦІВУ

26 сьнежня кіраўнічцы Берасьцейскай гарадзкой арганізацыі БНФ **Ніне Давыдоўскай** далі 49 тыс. руб. штрафу за распаўсюд улётак у Міжнародны дзень правоў чалавека. Н.Давыдоўская мае намер аспрэчваць гэтае рашэньне ў судзе. У той самы дзень міліцыя Смургоняў на паўтары гадзіны затрымала наклад «Местной газеты», якую выдавец **Рамуальд Улан** вёз з друкарні. Ня выявіўшы ніякіх парушэньняў, міліцыянты адпусьцілі затрыманых. 29 сьнежня адміністрацыйная камісія Партызанскага раёну Менску дала 25 тыс. штрафу актывістцы АГП **Людміле Гразновай,** затрыманай 30 лістапада на Камароўскім рынку падчас раздачы ўлётак супраць рэфэрэндуму. 2 студзеня ў Белаазерску невядомыя зьбілі старшыню гарадзкой арганізацыі БСДП (НГ) **Яўгена Акаронку** і яго жонку — дэпутатку гарсавету **Натальлю Акаронку**. Я.Акаронка з страсеньнем мазгоў й пераломамі быў дастаўлены ў хірургічнае аддзяленьне. Актывісты «Зубра» **Раман Казакевіч** і **Дар’я Малдаванава** 5 студзеня былі затрыманыя за распаўсюд калядных паштовак ад Эўрапейскай кааліцыі «Свабодная Беларусь». У Цэнтральным РУУС Менску на іх склалі пратакол за распаўсюд друкаванай прадукцыі без выходных зьвестак, хоць, паводле словаў затрыманых, выходныя зьвесткі былі. Праз гадзіну Рамана і Дар’ю адпусьцілі.

**АШ**

# Мары 2004

## Перамогі на выбарах, новыя кнігі, газэты, скульптуры, кенгуру і песьні

**Пажаданьні асабістыя і ня толькі, праекты і мары, зьвязаныя з Новым 2004 годам, выказваюць жыхары каралеўскага места над Нёманам і ваколіцаў.**

**Алесь Краўцэвіч**, гісторык, мае як прыватныя, так і грамадзкія мары: «Я хацеў бы дакончыць кнігу пра Вялікае Княства Літоўскае — літаратурна выпісаны падручнік з ілюстрацыямі, мапамі. Каб усім было цікава чытаць — і навукоўцам, і аматарам. Ну, і зьбіраюся працягваць выдаваць «Гістарычны альманах». Яшчэ хочацца, каб пасунулася будаўніцтва дому. Гэта бацькоўская хата, якую я перавёз пад Горадню. Трэба шыбы старыя заняніць і зрабіць падлогу, каб можна было летам там спыняцца. Гэта мая мара — з гораду ўцячы туды, каб жыць там потым настала. І яшчэ такая мара — хацелася б, каб улада цяперашняя ляснулася».

А **Цаліна Пагерыла**, дырэктарка гарадзенскага заапарку, уся пагружаная ў сваю працу, сваё захапленьне. Яна чакае, што ў наступным годзе працягнецца рэканструкцыя заапарку: «Яго плошча будзе павялічаная на паўтара гектара. Будуць пабудаваныя новыя памяшканьні для капытных зьвяроў і драпежных — ільвоў і тыграў. Заапарк дакупіць «сяброўак» для самцоў блакітнай антылёпы і кенгуру, якія вось ужо год сумуюць у адзіноце. Самец антылёпы каштаваў дзьве тысячы эўра, а кенгуру — 700 даляраў».

### Ваўкавыск-таксі

**Мікалай Аўтуховіч**, ваўкавыскі прадпрымальнік-галадоўшчык, чакае ад новага году ўзнаўленьня справядлівасьці. Для сп.Аўтуховіча і яго фірмы наперадзе яшчэ як мінімум два суды. «Мы ня ведаем, што гэты год нам прынясе. Але самае галоўнае — што таксоўкі працуюць, людзі не згубілі працы і зарабляюць грошы».

**Тадэвуш Гавін**, ганаровы старшыня Саюзу палякаў, застаецца перадусім палітыкам. Ён марыць, «каб нармальныя людзі выйгралі выбары ў парлямэнт і нешта пачалі зьмяняць у нашым жыцьці». У сп.Гавіна ў Польшчы выйшла новая кніга «Zwycięstwa i porazki». У студзені адбудзецца яе прэзэнтацыя ў Польшчы, а ў наступным месяцы — у Горадні.

**Мікола Маркевіч**, раней галоўны рэдактар «Пагоні», сёньня адзін з выдаўцоў газэты «День», якую ўлады ўсяляк перашкаджаюць друкаваць. Усе ягоныя спадзяваньні зьвязаныя зь любімай справай: «Каб паўстала газэта, якую будзем рабіць мы зь сябрамі і якая будзе добрай спадкаемцай «Пагоні». Але ёсьць і прыватныя мроі, пра свабоду: «Я мару, каб адразу пасьля заканчэньня тэрміну майго пакараньня было зьнята істотнае для мяне абмежаваньне, зьвязанае з выездам за мяжу. У мяне шмат сяброў на Беласточчыне, я мару, што мы вып’ем зь імі беластоцкага піва «Dojlidy» ў Беластоку дзе-небудзь у добрай кнайпе. І я вельмі хацеў бы дачакацца, калі мае дзеці пасьпяхова здадуць экзамэны. Каб іхнія мары збыліся, бо іхнія мары ёсьць і маімі».


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Многія гарадзенцы напісалі або пішуць кнігі. Кніжнасьць, культура друкаванага слова застаецца для беларусаў сэнсам і асновай. Для **Юр’я Гуменюка**, паэта, — тым больш: «Хачу, каб мая кніга «Вуліца тыгровых архідэяў» раскруцілася ў 2004-м. Каб тая кніга публіцыстычная, якую я задумаў яшчэ пры канцы XX ст., зьдзейсьнілася. І каб я ўвабраў у сябе шмат моцы, здароўя, натхненьня і нарэшце дапісаў свой раман «Апосталы нірваны».

### Каб адчынілася кавярня

А вось для маладога пакаленьня музыка ў жыцьці значыць больш, чым кнігі. **Вікторыя Фінская**, сьпявачка рок-гурту «Айша»: «Пажаданьне ад гурту «Айша»: каб адкрылася кавярня, дзе можна было б сустракацца творчай публіцы. Вялікая мара: каб нарэшце выпаў сьнег у нашым горадзе. Пляны: паехаць на тэлепраграму «Кропка» на БТ і паспаборнічаць зь нейкай добрай групай. Шмат хто аддаў туды свае музычныя заявы, але ні адказу, нічога».

**Андрэй Кусяльчук**, да нядаўняга часу супрацоўнік зачыненай уладамі «Ратушы», з горыччу аглядаецца назад, у год 2003-ці: «Я хачу зрэалізаваць тое, чаго ня здолеў у 2003-м: стварэньне інтэрнэт-парталу і інфармагенцтва. Я хацеў бы, каб у наступным годзе адбыліся сапраўдныя незалежныя дэмакратычныя выбары. І каб мой 2004 год быў лепшым ад усіх папярэдніх у фінансавым і асабістым пляне. Мінулы год ня быў вельмі добры для мяне асабіста і, напрыклад, для бізнэсу. Я хацеў бы, каб штосьці зьмянілася ў адносінах улады да бізнэсу, да незалежных СМІ й да грамадзкіх арганізацыяў. І каб наступны год зьмяніў нашае грамадзтва, каб яно адчула сябе сапраўдным грамадзтвам».

### Ліст ад Лукашэнкі

**Уладзімер Панцялееў**, акадэмік скульптуры Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва, старшыня абласной арганізацыі Саюзу мастакоў, наадварот, з уладамі ладзіў: «Я толькі што атрымаў ліст ад прэзыдэнта Лукашэнкі. Яшчэ нават не чытаў, вось гляджу: пратакол дару-чэньняў, гэта пасьля ягонай сустрэчы з прадстаўнікамі творчай інтэлігенцыі, я там быў адзіным прадстаўніком ад абласьцей. У нас будзе ў лютым выстава «Сучаснае мастацтва Горадні» — у Менску ў Палацы мастацтва. Гэта будзе выстава прафэсійнага мастацтва ўсёй вобласьці: жывапіс, графіка, скульптура, прыкладное мастацтва. Маіх будзе працаў дванаццаць. Мяне запрасілі на пленэр у Нямеччыну, які адбудзецца ў траўні, я паеду. Мару таксама, што ўсё ж такі я зраблю мэмарыяльную шыльду Васілю Быкаву, якая павінна зьявіцца ў нашым горадзе».

### Мытніцкі народны калектыў

Супрацоўнікі Ашмянскай мытні — самі маюць уладу. Яны спадзяюцца на расьсяленьне ў новым годзе. У 2002 г. Ашмянскую мытню аб’ядналі з Пастаўскай і Воранаўскай, колькасьць супрацоўнікаў павялічылася, а месца паменела. У 2004 г. частка супрацоўнікаў пераселіцца ў новы будынак, які цяпер знаходзіцца на рэканструкцыі. Галоўны інспэктар аддзелу кадраў Ашмянскай мытні **Алена Калыбіна** чакае, што ў 2004 г. зьменшыцца колькасьць фактаў кантрабанды ды мытных правапарушэньняў і людзі ўсьвядомяць, што трэба жыць у правапарадку. Але ня мытам адзіным жывуць мытары. Спн.Калыбіна таксама спадзяецца на посьпехі калектыву народнай самадзейнасьці «Зорныя росы», якім яна кіруе. У 2003 г. ансамбль атрымаў званьне народнага — гэта адзіны ў нашай краіне мытніцкі народны калектыў.

Размова з паловай удзельнікаў апытаньня адбылася ў невялікай кавярні, дзе прыватным чынам трывала навагодняя пагулянка журналістаў, пераважна незалежных ад дзяржаўнай працы. У той самай кавярні, адкрыцьця якой жадае сьпявачка «Айшы». Афіцыйна яна ніяк не адкрыецца зь незалежных ад гаспадароў прычынаў. А месца ўтульнае: кава, гарачыя круасаны і глінтвайн, ніякага дыму, як і «ў цывілізаванай Эўропе» (апошнія паведамленьні з Італіі і Галяндыі пра забарону паліць у рэстарацыях і кавярнях). Урыўкі сьвята чуваць на дыктафоннай стужцы, чутны шлягеры накшталт «Bo dla tango trzeba dwojga» — «Budki suflera». Завітаў яшчэ «дзедушка Мароз», які дакучліва прымушаў паэта Гуменюка прачытаць «сьцішок» — зусім як у сцэнарах «навагодніх ёлак», якія сам паэт калісьці выдумляў для дзетак, калі працаваў у лялечным тэатры. «Дзедушка» выпіў чарку гарэлкі, ад закускі адмовіўся. Дарэчы, а сьнег напраўду насыпаўся на гарадзенскі брук і чарапічныя дахі.

**Распытвалі Сяргей Максімовіч, Вераніка Дзядок**

# Беларусы сталі аптымістамі

Жыхары сталіцы задаволеныя як сваім дабрабытам, так і жыцьцём увогуле. Як вынікае з апытаньня сацыялягічнай службы БелаПАН «Люстра», 48% менчукоў лічаць прамінулы год удалым. Роўна ўдвая меней рэспандэнтаў (24%) маюць адваротнае меркаваньне. Гэткае задавальненьне грунтуецца на росьце грашовага дабрабыту, але ня толькі на ім. Бо толькі 32% людзей дэкляравалі паляпшэньне свайго матэрыяльнага становішча, 33% назвалі яго нязьменным. Тады як 29% рэспандэнтаў адчуваюць яго пагаршэньне.

У другой палове 90-х эканамічны рост не суправаджаўся пачуцьцем бясьпекі і стабільнасьці. Цяпер такое назіраецца. Справа ня столькі ў працэнтах росту ВУПаў і шмупаў. Зьмянілася мысьленьне людзей. Усё менш беларусаў чакаюць цудаў. Менш і спадзеваў на ласку дзяржавы. Людзі болей спадзяюцца на сябе і ўласныя сілы.

**Мікола Бугай**

# Юбілеі 2004

**У Польшчы 2004-ы абвешчаны годам Вітальда Гамбровіча, а ў Расеі — годам Міхала Глінкі. Дарэчы, у Беларускай энцыкляпэдыі Глінка называецца не расейскім, а проста кампазытарам — акцэнт робіцца на беларускім паходжаньні творцы. Зусім неабавязкова год называць імем гістарычнага дзеяча. Вось у Бразыліі 2004-ы абвешчаны годам памяці Айртана Сэны — акурат будуць дзясятыя ўгодкі гібелі гэтага гоншчыка «Формулы-1»... У Карэліі новы год будзе годам карэльскай тапанімікі, а ў Маскве — годам Астанкінскай тэлевежы. ААН абвесьціла наступны год годам рысу. Аказваецца, палова чалавецтва харчуецца амаль выключна рысам і рысу гэтага бракуе. Гэта будзе таксама год Алімпійскіх гульняў, парлямэнцкіх выбараў у Беларусі і 500-годзьдзя Будслаўскага касьцёлу.**

Налета споўніцца 975 гадоў ад нараджэньня Ўсяслава Чарадзея. 600 гадоў — з моманту ўваходжаньня Смаленскага княства ў Вялікае Княства Літоўскае. 475 — з моманту выданьня першага Статуту ВКЛ на старабеларускай мове. 375 гадоў таму пачалося жыцьцё Сімяона Полацкага, беларускага асьветніка ды інсьпіратара расейскай прафэсійнай паэзіі. А 25 гадоў таму зьявілася Беларуская майстроўня — першае ў пасьляваеннай Беларусі арганізаванае адраджэнскае аб’яднаньне. Праз Майстроўню прайшлі дзясяткі людзей, якія сталі пасьля прафэсійнымі дзеячамі культуры або палітыкі.

Цяпер перагледзім наступны год больш дэталёва, за месяцам месяц. Ужо **1 студзеня** 2004 г. споўнілася 75 гадоў Акадэміі навук Беларусі. Гэта не было фармальнае перайменаваньне Інстытуту беларускай культуры. Інбелкульт існаваў у часе нядоўгай савецкай беларусізацыі і быў яе флягманам, а Акадэмія навук ад пачатку ставілася да Беларушчыны бюракратычна. Тут часта служылі ня столькі навукоўцы, колькі ўладзе — што ў сталінскія часы, што пры цяперашнім аўтарытарызьме.

Было б дзіўна, калі б сярод соцень супрацоўнікаў АН не зьяўляліся сапраўдныя прафэсіяналы, паважаныя навукоўцы, а то й бунтаўнікі. Кожнаму даводзілася нямала сілаў траціць на змаганьне зь бюракратызмам. **12 студзеня** споўніцца 75 гадоў Зьмітру Бугаёву — аднаму з галоў-



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

ных прадстаўнікоў акадэмічнае плыні ў літаратурнай крытыцы. Ужо шмат гадоў студэнты вывучаюць беларускую літаратуру па кнігах прафэсара Бугаёва.

Наступны юбілей мог бы даць імя ўсяму году. **25 студзеня** споўніцца 200 гадоў ад нараджэньня паэта, мэмуарыста, аўтара «Песьні філярэтаў» Антона Адынца. Колькі ні пішы пра яго, усё напісане будзе пра тагачасную Беларусь. Вось Гейстуны на Ашмяншчыне. Малюнак Напалеона Орды з подпісам аўтара: «Уласнасьць паэта Антона Эдварда Адынца. Тут ён нарадзіўся». А вось палац у Прылуках пад Менскам, якому Адынец прысьвяціў баляду. А вось касьцёл у Крашыне пад Баранавічамі. Тут у 1884 г., вярнуўшыся з Чылі, слухаў імшу Ігнат Дамейка. Яго суправаджаў сябар Антон Адынец. Два старыя пасадзілі тут два дубкі. Усталявалі памятны камень, на якім быў выбіты верш Адынца. Кажуць, выбіваў той верш крашынскі каваль Паўлюк Багрым... Вось такія легенды. Юбілей Адынца мог бы стаць у Беларусі прыгожай падзеяй. Калі б выйшлі па-беларуску ягоныя мэмуары ды зьявілася кніга пра яго самога.

**31 студзеня** споўніцца 75 гадоў гісторыку і грамадзкаму дзеячу Анатолю Грыцке-



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

вічу. Скончыў доктар Грыцкевіч мэдінстытут і інстытут замежных моваў, а стаў гісторыкам.

**4 лютага** — 75-гадовы юбілей Лявона Баразны. Баразна загінуў у 1972 г. Абставіны забойства ня высьветленыя, але многае паказвае на дачыненьне КГБ. Лявон Баразна — мастак, мастацтвазнаўца, адзін зь лідэраў адраджэнскага руху. Пад яго ўплывам выхоўваліся Зянон Пазьняк, Алесь Марачкін ды інш.

А **15 лютага** споўніцца 100 гадоў Ларысе Александроўскай. Ёй выпала стаць увасабленьнем шчасьлівай савецкай Беларусі, якая не зважае на масавыя рэпрэсіі, прыватныя чалавечыя трагедыі і татальную русіфікацыю. Яна сьпявала Сталіну пра Беларусь. Яна сьпявала дэлегатам XVI зьезду КПБ: Чарвякову, які праз тыдзень скончыць жыцьцё самагубствам, Галадзеду, які выкінецца з акна будынку НКВД, Шаранговічу, якога расстраляюць, як і большую частку дэлегатаў таго зьезду... Яна сьпявала ім «Бывайце здаровы». Гэта была прэм’ера песьні.

**1 сакавіка** споўніцца 75 гадоў паэтцы Еўдакіі Лось. Міхась Скобла ў сваёй паэтычнай анталёгіі XX ст. піша пра яе: «Перакладала каўкаскіх джыгітаў, сярэднеазіяцкіх акынаў і сьвята верыла ў савецкі літаратурны інтэрнацыянал». Баялася сваё любіць больш, чым чужое. Мабыць, таму ў 1967 г. проста ў Саюзе пісьменьнікаў спаліла зборнік вершаў Ларысы Геніюш «Невадам зь Нёману». Самапрыніжэньне і сёньня дае сябе знаць у Беларусі, што ў літаратуры, што ў палітыцы.

**14 сакавіка** ў сьвеце будуць адзначаць 125-годзьдзе бацькі сучаснай фізыкі Альбэрта Айнштайна. А **25 сака-**



WWW.NIGHTSCRIBE.COM

**віка** — у Дзень Волі — споўніцца 50 гадоў Уладзімеру Кур’яну, кампазытару, які на-



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

пісаў музыку да знакамітых спэктакляў Купалаўскага тэатру «Тутэйшыя» і «Ідылія».

У красавіку — два стогадовыя юбілеі: **6-га** нарадзіўся паэт Мікола Хведаровіч, які 18 гадоў жыцьця правёў у сталінскіх лягерах, а **25-га** — Васіль Барысенка, які з 1937 г. узначальваў Інстытут літаратуры АН БССР. Пры Барысенку сотні беларускіх літаратараў былі расстраляныя і высланыя.

Травень 2004 г. адзначыцца трыма юбілеямі. **6-га** споўніцца сто гадоў Паўлюку Трусу — аднаму зь любімых беларускіх паэтаў, які памёр 25-гадовым і пахаваны на Вайсковых могілках у сталіцы. **11 траўня** таксама 100 гадоў будзе каталёнскаму мастаку Сальвадору Далі. А **24-га** —



стогадовы юбілей Адама Русака, на вершы якога было напісана пад 300 песень, у тым ліку і згаданая «Бывайце здаровы». Пясьняр калгаснага шчасьця скончыў Ленінградзкую кансэрваторыю па клясе скрыпкі і валторны.

І яшчэ адна травеньская дата. **20 траўня** 350 гадоў таму войскі расейскага цара Аляксея Міхайлавіча перайшлі мяжу ВКЛ. За 12 гадоў вайны насельніцтва Беларусі зьменшылася напалову.

**1 чэрвеня** споўніцца 200 гадоў ад нараджэньня згаданага ўжо Міхала Глінкі. А **27-га** адзначыць свае 50-я народзіны паэт Павал Марціновіч.

Ушануйма таго, хто йдзе
Напярэймы глухім навалам,
Не губляючы анідзе
Веры ў гулкі акорд фіналу.

Але тройчы ўшануйма тых,
Хто ступаў на сваю дарогу
Зь непахіснасьцю правaты,
Без надзеі на перамогу!

**4 ліпеня** споўніцца 100 гадоў з дня нараджэньня Анатоля Альшэўскага. Яго, як і сотні іншых заходнебеларускіх камуністаў, польская ўлада кідае ў турму і пасьля абменьвае на палітвязьняў з СССР — краіны, пра якую яны марылі. А там іх папросту расстрэльваюць. Як польскіх шпіёнаў. Імем гэтага Альшэўскага названая ў Менску адна з прыкметных вуліц.

**9 ліпеня** споўніцца 50 гадоў скульптарцы Сьвятлане Гарбуновай, аўтарцы помніка Сымону Буднаму ў Нясьвіжы. Ейны юбілей папярэднічае стагодзьдзю адразу двух літаратурных Нобэлеўскіх ляўрэатаў. **12 ліпеня** нарадзіўся чыліец Пабла Нэруда, а **14-га** — амэрыканец Ісак Башэвіс Зынгер, які прыйшоў на сьвет на вуліцы Крухмальнай у Варшаве.

**15 ліпеня** споўніцца 100 гадоў з дня сьмерці расейскага пісьменьніка Антона Чэхава.

**6 жніўня** — 100 гадоў Цімоху Гарбунову, які працаўзяглы час быў старшынём Вярхоўнага Савету БССР, **7-га** — 125 гадоў Пётру Крачэўскаму, старшыню Рады БНР, **30-га** — 50 гадоў Аляксандру Лукашэнку. Краіна ў іх была адна, а дзяржавы зусім розныя.

**10 жніўня** споўніцца 75 гадоў паэту Алесю Ставеру. Яго імя патроху сьціраецца з энцыклапэдыяў, а вершы — з анталёгіяў. Аднак застаюцца песьні — «Жураўлі на Палесьсе ляцяць», «Беларусачка»...

**28 жніўня** мы адзначым 75-ю гадавіну «Дня калектывізацыі», калі за адзін дзень было створана паўтары сотні калгасаў, а партыйныя кіраўнікі выступілі з ініцыятываю зрабіць усю савецкую Беларусь «зонай суцэльнай калектывізацыі». Для гаспадарлівых сялян краіна сапраўды стала зонай.

**30 жніўня** споўніцца 200 гадоў Аляксандру Ходзьку. Ён нарадзіўся ў Крывічах Вялейскага павету. Пасьля вучобы патрапіў на расейскую дыпляматычную службу ў Пэрсію, стаў вучоным-усходазнаўцам. Падарожнічаў па сьвеце, пакуль урэшце не пасяліўся назаўсёды ў Парыжы. Яго паэзія поўная беларускага (як тады казалі, літоўскага) патрыятызму.

У верасьні мы адзначым 75-гадовыя юбілеі: **10-га** — кампазытара Яўгена Глебава і **15-га** — мастака Арлена Кашкурэвіча. **29 верасьня** споўніцца 100 гадоў кінарэжысэру Льву Голубу, які зьняў знакавыя беларускія савецкія фільмы «Анюцін дарога», «Палянэз Агінскага», «Дзяўчынка шукае бацьку». За «Дзяўчынку» Голуб атрымаў прызы на міжнародных кінафэстывалях у Аргентыне і Італіі.



WWW.TIWY.COM

**Пабла Нэруда**



WWW.PLANETMARK.COM

**Оскар Ўайльд**

**10 кастрычніка** будзе 75 гадоў Марату Казею, юнаму партызану, а **16-га** — 150 гадоў Оскару Ўайльду, які напісаў «Партрэт Дарыяна Грэя».

**21 сьнежня** споўніцца 125 гадоў Іосіфу Сталіну.

Юбілейны каляндар 2004 году ня дасьць нам скончыць на гэткай нясьветлай ноце. Мы згадаем таленавітага беларускага паэта Алеся Дудара, чыё стагодзьдзе прыпадзе



на **24 сьнежня**. Дудар справядліва лічыўся фаварытам маладой беларускай паэзіі і 37-га не перажыў. Арыштавалі яго за верш «Пасеклі наш край», з кожнага радка якога чуваць праўда, сугучная і сёньняшняму дню:

Пасеклі наш Край папалам,
Каб панскай вытаргаваць ласкі.
Вось гэта — вам, а гэта — нам,
Няма сумленьня ў душах
рабскіх.

(...)

За ўсходнім дэспатам-царком
Мы бегаем на задніх лапах,
Нью-Ёрку грозім кулаком
І Чэмбэрлена трапна лаем.

Засыплем шапкамі яго,
Ура, ура — патопім ў соплях.
А нас тым часам з году ў год
Тут прадаюць ўраздроб і
оптам.

Мы не шкадуем мазалёў
Мы за чужых праклёны роім,
Але бяз торгу і бяз слоў
Мы аддаём сваіх герояў.

Ня сьмеем нават гаварыць
І думаць без крамлёўскай візы,
Бяз нас ўсё робяць махляры
Ды міжнародныя падлізы.

(...)

...О, ганьба, ганьба! Ў нашы дні
Такі разлом, туга такая!
І баюць байкі баюны
Северо-Западного края...

(...)

Але яшчэ глушыце крой.
Гарыць душа, і час настане,
Калі з-за поля, з-за бароў
Па-беларуску сонца гляне.

Тады мы ў шэрагах сваіх,
Быць можа, шмат каго ня
ўбачым,
З тугою ў сэрцы ўспомнім іх,
Але ніколі не заплачам.

А дзень чырвоны зацьвіце,
І мы гукнём яму:
«Дабрыдзень».
І са шчытом ці на шчыце
Ў краіну нашу зноў мы
прыйдзем.

Пакідаю Вас сам-насам з Алесем Дударом і думкамі пра наступны 2004 год.

**СД**

## Эўразьвяз ужо даў сыгнал

**Сяргей Навумчык (№48, 2003) піша: «Патрэбны нейкі канкрэтны сыгнал з боку ЭЗ, каб выразна прагучала: дзьверы ў Эўразьвяз для Беларусі ў прынцыпе адчыненыя...»** Дазволю сабе прагноз: такога сыгналу, ці, як цяпер модна казаць «мэсыджу», — ня будзе».

Вось цытата з выступу новай міністаркі замежных справаў Швэцыі Лайлы Фрэйвальдс датычна палітыкі Эўразьвязу да краінаў Эўропы, якія застаюцца па-за яго межамі: «Мы падтрымліваем шлях Баўгарыі і Румыніі да ЭЗ. Рэформы ў Турэччыне таксама накіраваныя на будучае сяброўства гэтай краіны ў ЭЗ. У адносінах да краінаў Балканаў ЭЗ мае толькі адну стратэгію — стратэгію адкрытасьці. Я лічу — не існуе іншай альтэрнатывы, як інтэграцыя балканскіх краінаў у ЭЗ. Такі самы падыход мы маем да Украіны, Малдовы і нават да Беларусі, разумеючы, што рух гэтай краіны зойме больш доўгі час».

Поўны тэкст выступу на швэдзкай мове даступны праз Інтэрнэт: http://www.palmecenter.se

Гэта думка не «ўплывовага палітоляга», а рэальнага палітыка, які вызначае, разам з калегамі, замежную стратэгію ЭЗ. Палітыка ёсьць мастацтвам кампрамісу. У беларускіх умовах гэта значыць: захоўваючы добрыя стасункі з Расеяй, палепшыць адносіны з ЗША, адначасова набліжаючы краіну да стандартаў сяброўства ў Эўразьвязе.

Па-бальшавіцку шукаць нобр ворага там, дзе яго няма, — значыць, сьвядома ці несьвядома, рабіць шкоду беларускім інтарэсам.

**Швэдзкі карэспандэнт «НН»**

## Ліст да Дзеда Мароза

**Паважаны Дзядуля Мароз, гэта добра, што ты зьявіўся ў нашай краіне.** Але вельмі засмучае, вельмі настрой псуе тое, што дажыў Ты да гадоў мудраца, але мудрасьці так і не набраўся. Хіба ж можна мудрацу з сваім народам, асабліва зь дзецьмі, размаўляць на чужой мове? Бо выхаваныя Табою на чужой культуры, на чужой мове дзеткі нашай дзяржавы ніколі ня стануць добрымі людзьмі ў поўным сэнсе гэтага слова, я ўжо нават не кажу пра нейкіх там патрыётаў. Таму што мова і патрыятызм — гэта непадзельнае ядро. Яшчэ 2500 гадоў таму Канфуцый пісаў: «На роднай мове выхоўваецца чалавек, на чужой — драпежнік».

Дзядуля Мароз Белавескі, добра падумай над сэнсам свайго прызначэньня, каб навекі застацца жаданым і любым для нашага народу, а ня быць праклятым, як той Юда.

**Дзядуля-Патрыёт з сваімі ўнукамі з Пружанаў**

## Міліцыя на роварах

**У нумары за 19 сьнежня мінулага году ў «НН» была зьмешчана інфармацыя пра тое, што ў Бабруйску мясцовая міліцыя завінавацілася за паліва 130 млн рублёў.** Прыгадалася размова наконт гэтага з знаёмым, які дзяліўся ўражаньнямі ад летняй вандроўкі ў Літву. Сярод мноства тамтэйшых адметнасьцяў ён выдзеліў той факт, што ў адным з курортных гарадкоў тамтэйшыя «мянты» на патруляваньне выяжджаюць на... вэлясыпэдах.

Уяўляеце, колькі грошай эканоміцца на паліве, запчастках, і наагул, купіць вэлясыпэд — гэта не аўтамабіль.

Я не прапаную поўнасьцю адмаўляцца ад аўтамабіляў для міліцыі. Але ў невялікіх райцэнтрах пры патруляваньні выгада ад міліцыянэраў на вэлясыпэдах будзе заўважнай.

**Мар'ян Вянгроўскі, Астравец**

## За легалізацыю допінгу

**Прачытаў я пра Аляксандру Герасіменю ў «НН» №47'2003, і захацелася мне абараніць дзяўчыну — відаць, мне «такія падабаюцца».** Допінг у спорце — рэч непрыемная і непажаданая, але ж давайце ацэньваць спорт сучасны, а не такі, якім ён быў гадоў дзесяць таму. Гатовы паспрачацца з кім заўгодна, што з сучасных спартоўцаў ніхто не пазьбягае допінгу. Нават чатырохразовы алімпійскі чэмпіён-2002 па біятлёне Оле-Эйнар Б'ёрндален ужывае лекі ад астмы, на якую нібыта хварэе, каб забясьпечыць лепшую працу лёгкіх падчас напружаных лыжных забегаў.

Іншая справа, што багацейшыя ўжываюць звышсучасныя мэдыкамэнты, якія ніводзін допінг-тэст ня вызначыць, а нашыя — тое, што можна дастаць за невялікія грошы і вывесьці з арганізму да таго, як іх папросяць здаць допінг-пробу. Таму калі і ёсьць у чым абвінавачваць нашых спартовак, дык гэта ў тым, што своечасова «не схаваліся».

Спорт перавтварыўся з выключна спаборніцтва асобаў у супэрніцтва лябараторыяў і НДІ. Таму, на мой погляд, слушнай выглядае думка пра легалізацыю допінгу. Кожны спартовец так ці інакш спажывае тую ці іншую фармакалёгію, бо падтрымліваць фізычную форму на працягу году безь яе немагчыма. А так перад кожным паўстане праблема выбару: здароў'е ці рэкорды — і кожны будзе вольны абіраць сам. Бо цяпер вельмі часта за спартоўцаў гэты выбар робяць трэнэры і дактары, якія рэкамэндуюць «папіць вітамінчыкаў».

**Зьміцер Казлоўскі, Менск**

### УДАКЛАДНЕНЬНЕ

Інфармацыя адносна нас, надрукаваная ў №46 і 47 «НН», у матэрыялах пра зьезд Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі — БНФ, неправдзівая. Верагодна, карэспандэнт «НН» грунтаваўся на моцна перабольшаных чутках.

**Анатоль Крыварот, Валянціна Мароз**

**«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні.** З прычыны вялікага аб'ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваньня дописаў. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць дописы поштай, электроннай поштай ці факсам. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail: nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.

## Фітнэс у Купалавым садзе

Працяг са старонкі 2.

— А горадабудаўнічая сытуацыя дазваляе разьмясьціць аб'ём дому, пляцоўкі».

Саюз пісьменьнікаў, ТБМ, Таварыства аховы помнікаў зьвярталіся ў Мінкульт з просьбай уключыць дом на Румянцава, 7 у Дзяржаўны сьпіс гісторыка-культурных каштоўнасьцяў. Мала таго што тут жыла Купалава сям'я — будынак мае і архітэктурную вартасьць. На сёньня такіх захаваліся адзінкі. Збудавалі яго ў 1949-м паводле праекту славутых Уладзімера Караля і Сяргея Сьпяранскага, якім была даручаная распрацоўка дамоў для дзяржаўных службоўцаў, творчай інтэлігенцыі і выдатных дзеячоў беларускай культуры.

Атрымаўшы прапановы надаць дому статус гісторыка-культурнай каштоўнасьці, Дэпартамэнт, згодна з законам, мусіў забясьпечыць ахову помніка. Гэтага зроблена не было. Прапановы не былі нават прынятыя да разгляду.

Канчаткова лёс дому Купалавай сям'і вырашаўся ў кабінэце Чадовіча. 15 кастрычніка, падчас адмысловае нарады, Абламскі, Чарняўскі, чыноўнікі Менгарвыканкаму пастанавілі разбурэньне ўхваліць, а на сьцяне новага дому пасьля... павесіць «інфармацыйную дошку, якая адлюстроўвае гісторыю дому і яго жыхароў». Было б добра, каб на гэтым мэмарыяльным знаку зьявіліся яшчэ й прозьвішчы тых, хто спрыяў зьнішчэньню.

Нягледзячы нават на заяву міністра культуры Леаніда Гуляка, які публічна паабяцаў узяць пад асабісты кантроль лёс дамка Ўладзіслава Францаўны, у першыя дні Новага году будынак пачалі бурыць. Разабраны дах. Сьпілаваны стары сад. Толькі пад сьнегам і сьмецьцем у двары ляжыць старая гранітная надмагільная стэла, перанесеная з Вайсковых могілак, — першая памятка па Песьняру. На ёй напісана, што тут спачывае душа Янкі Купалы.

**Тамара Габрусь**, доктар мастацтвазнаўства, кандыдат архітэктуры
**Уладзімер Дзянісаў**, намесьнік старшыні Менскае гарадзкое рады Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры

## Дык падпісвайся!

Падпісацца на «НН» можна на любой пошце. У Менску таксама прымаецца **падпіска на шапікі «Белсаюздруку»** або праз прыватныя сыстэмы дастаўкі **«Эй Бі ПрэсСэрвіс» і «Рэм-Інфо»**. «Наша Ніва» — крыніца інфармацыі і грунтоўны аналітык беларускага і міжнароднага жыцьця.

# Мастацтва разьведкі неапрацаваных алмазаў

ARCHE, №5, 2003.
Спадчына, №5—6, 2002.

Рэцэнзія на «Спадчыну» не спазьнілася. Гэта проста выдаўцы выконваюць свае абавязкі перад падпісчыкамі пазамінулага году. Раней пяцігодкі давалі за чатыры гады, цяпер — дай божа, калі за сем.

Але, калі ласка, не спыняйце чытаць. Я ня толькі пра сумнае — я пішу, каб расказаць пра два найлепшыя выданьні для тых няшчасных, якім для адчуваньня паўнаты жыцьця мала Веркі Сярдзючкі і Алы Барысаўны, а хочацца больш складанай пажывы для розуму.

У «Віленскім ARCHE» такі чалавек знойдзе ўнікальныя матэрыялы пра старую беларускую сталіцу. Зьніклы літоўскі Ерусалім (Віталь Зайка), беларуская Вільня 90-х (Андранік Антанян), духоўнасьць Вільні (Чэслаў Мілаш) і фундамэнтальная «Вільня. Анталёгія беларускай паэзіі», укладзеная былым рэдактарам «НН» Сяргеем Дубаўцом. Тут жа — сканчэньні вельмі мілага бэстсэлеру Міхала Вівэга «Выхаваньне дзяўчат у Чэхіі», душэўныя успаміны Валянціна Тараса пра літаратурнае і палітычнае жыцьцё Беларусі савецкай і надрыўнага дзёньніка Вячаслава Адамчыка. Дарэчы, крытык Леанід Галубовіч назваў гэты дзёньнік «кнігай году».

У «Спадчыне» — небанальныя рэфлексіі Міколы Нікалаева пра 70-гадовы крывавы вір, у якім гартавалася Вялікае Княства Літоўскае ў XIII—XIV ст., перш чым ператварыцца ў магутную дзяржаву Гедыміна. Тамсама працоўны допытаў казакаў, паланёных войскам Януша Радзівіла, дакумэнты з сакрэтных архіваў «Ковенскае Літвы», якія датычаць арганізацыі беларускай партызанкі, і іншыя інтрыгоўныя сьведчаньні. Напрыклад, пра рэстараннае жыцьцё беларускага студэнцтва ў Чэхіі 1930-х.



АРЦЁМ ЛЯВА

Што ж сумнага? Першая бяда — зашмат перакладаў. Карціць болей уласных думак, нават, калі хочаце, з сваёй званіцы. Каб свой для сваіх пра сваё. Прыеліся погляды збоку і ўнівэрсальна-лібэральныя рэцэпты. Дайшло да таго, што і пра беларускую палітыку беларускія аўтары часам у інтэлектуальных часопісах пішуць так, быццам бы ў рубрыку «Ўбачанае зь Нью-Ёрку».

Галоўная ж бяда абодвух выданьняў — нязжытая занавуковасьць большасьці тэкстаў. Няўменьне і нежаданьне пісаць чытэльна, добрай прозай. Пісаць *для аўдыторыі*, прычым для *беларускай* аўдыторыі.

Не дабіваючыся якаснага часопіснага пісаньня, аўтары і рэдактары «ARCHE», і «Спадчыны» фактычна дазваляюць дзяржаве (-ам) навязваць свой фармат і стыль гуманітарных навук.

Штат навукоўцаў мусіць прадукаваць пэўную колькасьць навуковых публікацый, інакш перастане атрымліваць прызначаныя на гэта грошы. Вось і запоўненыя часопісы нуднымі, фармалізаванымі артыкуламі. Ня важна, што аўтары не выконваюць ідэалягічнага заказу дзяржавы (-аў) непасрэдна. Іх і без таго зьвязвае па руках і нагах сам дыскурс. Па-другое, гэтая навуковасьць пісаньня — ave censor — абмяжоўвае ўплыў іхнае пісаніны праклятай тысячай экзэмпляраў. Калі інтэлектуалы хочуць, каб да іх прыслухоўвалася нацыя, хай навучаюцца падаваць вынік сваіх дасьледаваньняў даступна і цікава. Як Эдвард Кінан ці Жак Лё Гоф.

Тое самае і з апрацоўкай матэрыялаў рэдактарамі. Скажам, кангеніяльная «Вільня. Анталёгія беларускай паэзіі», як і нарысы пра Вільню нашаніўскую, габрэйскую, зьніклую etc. без ілюстрацый прыцягваюць да сябе ўвагу прыкладна з тым жа посьпехам, як «Playboy» без карцінак.

У «Спадчыне» ілюстрацый шмат. Ствараецца ўражаньне, быццам бы часопіс прызначаны для аматараў, а не прафэсіяналаў гісторыі. Але тэксты ўваходзяць у поўную супярэчнасьць з ілюстрацыямі. Большасьць публікацый мусілі б зьявіцца не ў папулярным часопісе, а ў навуковым зборніку.

Ад таго, ці здолеюць урэшце пераарыентавацца з патрэбаў (жменькі) прафэсіяналаў на запатрабаваньні (патэнцыйна тысячаў) аматараў, залежыць і эканамічны посьпех нашых спарадычна пэрыядычных часопісаў, якія залягаюць на дно фінансавага крызысу ня менш пэрыядычна, чым выходзяць.

На дылетанта — аматара разумнае чытанкі ў гэтай краіне выдаўцы пакуль не разьлічваюць. А паколькі стаць прафэсіяналам гістарычнае, палітычнае, літаратурнае і іншых навук лёс табе шанцаў болей не пакідае і ў той жа час прырода зрабіла цябе няшчасным, якому хочацца разумнага чытва, табе трэба ўмець адшукваць неапрацаваныя алмазы ў пародзе акадэмічнае пэрыёдыкі. Табе гэты занятак, папраўдзе, прыносіць задавальненьне. Толькі ў такім ускладненым атрыманьні асалоды ёсьць нешта ненармальнае.

**Сяргей Гезгала**

# Зялёная сьвечка НЯСЬВІЖУ

Астраўкі «культурнай» прыроды старых паркаў яшчэ ўсё вылучаюцца на фоне дзядоўнікава-асотавай вясковай занядбанасьці.

Валеры Дранчук

Велічны камень на паўднёвым рагавым спуску Старога парку цяжка ня ўбачыць. Чытаю словы каліграфічнай лацінкі: «У гонар закладкі парку Марыяй дэ Кастэлян, княгіняй Радзівіл, і ў гонар аздабленьня ваколіцаў за столькі ж гадоў камень гэты паставіў яе ўдзячны муж Антоні Радзівіл, XIV ардынат Нясьвіскі». Прыходжу як на сьвятло — прыклад жаночай патужнасьці, ганараваны прыгожа і па-мужчынску годна. Удзячная памяць — як прыклад на будучыню. Ці ёсьць аналягі ўшанаваньня *гэткай* патужнасьці — на аздабленьне і ўкрасу зялёнага ўлоньня радзімы, культурнага айчыннага краявіду — дзе-небудзь яшчэ ў Беларусі? Сумняюся…

Каменю, тым часам, спаўняецца 100, парку — 125. Дзьве юбілейныя даты.

Юбілей Нясьвіскага парку мінуў неўпрыкметку і марна. Адна з найярчэйшых зялёных сьвечак беларускай мінуўшчыны засталася незапаленай. Між тым, яна магла асьвятліць увесь 2003 год.

Апошні раз, калі быў у Нясьвіжы, паспрабаваў сустрэцца з Рыгорам Лістападам, які цягам жыцьця апекаваўся паркам. Да драбнічкі ведаў відавы склад ня толькі дрэваў, але траў і кветак, мог расказаць і паказаць. Галоўнае, шмат рупіўся, рабіў — падсаджваў, даглядаў, беражліва захоўваў, ашчаджаў і адраджаў.

Мне давялі хатні нумар Рыгора Ксенафонтавіча, і я патэлефанаваў. Слухаўку ўзяла ўнучка. Дала сказаць два словы, затым перабіла: «Говорите по-русски!». Я папрасіў цярплівасьці, суразмоўніца памякчэла. Аднак тое, што я пачуў, ня ўзрадавала. Восемдзесятгадовы стары — дай Бог яму паздаравець! — ня мае памяці і амаль не гаворыць. Заставалася толькі цяжка ўздыхнуць: упушчаны час ды страчаная магчымасьць. Як не стае сярод нас летапісцаў! Каб побач такіх, як Лістапад, стаялі чэргі ахвотных — атрымаць ягоны ўспамін, дакумэнтальную памятку жывое легенды.

Лікам сядзібныя паркі сягаюць за сотню. А мо дзьве і тры. Перапісаць нядоўга — важна рэанімаваць, адрадзіць, вярнуць у культурны кантэкст хоць бы самыя значныя, найістотнейшыя, на ўзор якіх пачнуць адраджацца, парадкавацца іншыя, астатнія.

Бывала, станеш у якім-небудзь зручным ды ўтульным куточку былога маёнтку, сярод крапівы на падмурку, на друзе маёлікі — і шмат чаго прымроіцца пад гукі сьветлатужлівых шапэнаўскіх п’есаў. Даляцяць галасы з высокай вэранды, шэпт каханкаў паміж пацалункамі, грукат брычкі на ўезьдзе…

Гэтыя невялічкія выспачкі «культурнай» прыроды яшчэ ўсё выразныя на фоне дзядоўнікава-асотавай вясковай занядбанасьці. Быццам выжываюць сваёй «культурнасьцю», трываласьцю даўных-прадаўных прышчэпак. Справа не ў геамэтрыі, а ў густоўнай выкшталцонай мадэльнасьці, якая і розьніць запусьцелыя структураваныя сыстэмы ад будзённага навакольля.

Але тое ж пытаньне. Хто будзе імі апекавацца, весьці хоць які догляд? Падкошваць, прыбіраць сьцежкі, рабіць вясновую падрэзку сучкоў, падсадку і г.д. Калгас, сельсавет ці тая ж школа? Альбо мясцовы энтузіяст, валанцёрская арганізацыя з найбліжэйшага гораду — хто? Бадай, няма на што разьлічваць сёньня: спадчына адышла на далёкі плян, дзяржаўны энтузіязм палягае на іншых каштоўнасьцях.

Сказаць, што дзяржава ўбаку, — нічога не сказаць, бо дзяржавай не запатрабавана асоба. Уладныя структуры ўжо даўно не пакідаюць месца грамадзкай ініцыятыве на ратаваньне Бацькаўшчыны.

Магчымасьць даць ганаровы картблянш чалавеку, які гатовы ўзяцца за аднаўленьне такога парку, ці пэўныя льготы — грамадзкай арганізацыі, якая наважыцца яго адраджаць, — у дзяржавы была і ёсьць. Гэтую магчымасьць можна лёгка знайсьці ў тым жа экалягічным бюджэце. Сёньня мы, грамадзкасьць, нічога ня ведаем пра тое, на якія патрэбы ён траціцца. Чыноўнікі ад экалёгіі і фінансаў пільна ахоўваюць гэтую таямніцу, каб у пэўны час і пад чарговы «ўказ» закрыць дзіркі ў дзяржбюджэце, адлічыць ільвіную долю на рэстаўрацыю калгаснай сыстэмы ці, у найлепшым выпадку, на выдаленьне гноевай жыжкі з жывёлагадоўчых фэрмаў.

Мая першая сустрэча з паркам адбылася ў 1964 годзе, узімку. Шасьцікласьнік, я прыехаў у Нясьвіж са свайго недалёчкага хутару забраць акуляры ў гарадзкой оптыцы. Да аўтобуса ставала часу, я рушыў у парк. Быў прыгожы зімовы дзянёк, сонца плыло скрозь рэдкія шэрыя хмары. Зьбіралася на мяцеліцу, сыпаў марозьлівы сьнег, навокал ляжалі гурбы. Дрэвы ўзіраліся ў мяне, быццам пыталіся ці мо спрабавалі штось распавесьці. Абвостраным сьвежым зрокам я сягаў іхнай велічы, задзіраючы галаву ды мераючы позіркам тоўшчу камлёў у абоймах сумётаў. Я добра ведаў, што такое лес. Але гэта быў ня лес. І ня поймавы алешнік, не сядзібны сад, ня дрэвы ў двары за ганкам свае хаты. Гэта быў *парк* — усё разам. Ягоны малюнак доўга заставаўся на памяці.

Пасьля, колькі бываў у Нясьвіжы, ніколі не забываўся на гэтыя сьцежкі, ішоў сюды як на покліч — і ў студзеньскую сьвежасьць, і ў сьпякотны ліпеньскі поўдзень.

Быў час, я чакаў, што ў парку здарыцца вялікае каханьне. Аднак лёсу былі больш даспадобы мае самотныя блуканьні між дрэваў. Калі падрасла дачка, я ўпершыню прывёз яе ў парк разам з бабуляй, маёй мамай. Здагадваюся, што пасьля і яна ня раз была тут сам-насам з дрэвамі ды прымглёным сьветам шляхецкай мінуўшчыны. Дзіця, яно хадзіла маімі ж сьцежкамі.

Цяпер час ад часу прыяжджаю сюды з жонкай. Колькі разоў парываліся адзначыць дзе-небудзь пад дрэвамі на лужку дні народзінаў. Свае, дзяцей або родных. Але нечага ўсё ж не ставала. Заставаліся дома ў звычайным коле за накрытым сталом. Так прасьцей, хоць і марна.

Часьцей бываю тут, як некалі, адзін. І гэта ўжо інакшыя стасункі — з даўнім старым знаёмым, сябрам і мудрым настаўнікам. Сьведкам юнацкасьці, пачуцьцяў і мараў, надзей на годную будучыню. Цяпер — сьведкам пэўнай расчараванасьці, але й нязгубленага аптымізму: сьвет ідэалаў ня згасьне ў вачах, пакуль на гэтым Божым улоньні.

Яшчэ ў юнацтве, распытваючы дзядулю ды запісваючы тое-сёе зь ягоных расповедаў-успамінаў, я адшукаў у сваім радаводзе дэталь, на якую зрэдчас і ўсё часьцей азіраюся: адзін з нашых родных выехаў у Амэрыку і ў хуткім часе стаў уладальнікам парку. На жаль, я не раскапаў той згадкі (мо, калі б пачаў, хапіла б на цэлую кнігу), хіба ўжо дзеці якнебудзь дойдуць... Але нешта ў гэтым ёсьць — як парастак надзеі?

Гляджу на дуб, што расьце ад мяне за сотню метраў. Нас падзяляе густое калгаснае жыта. Дуб ацалеў, яму, кажуць знаўцы, пад дзьвесьце гадоў. У гэтай ваколіцы волату няма роўных, хіба што ў наднёманскіх урочышчах — за вёрстаў дзесяць—дванаццаць.

Гэты дуб для мяне — як узьняты палец трывогі. Ідзе непрыкметны працэс адчужэньня людзей ад ляндшафту. Можа, таму, што за апошнія паўвека наш край пабрыдчэў, залішне камунікаваўся, ператварыўся ў аграляндшафт: простыя дарогі, парэзаныя каналамі былыя багны, куды ні зірні — гарызонты, пажаваныя лініямі электраперадач...

У конадзень Раства і Новага году атрымаў вестку зь Нясьвіжу: у гонар 125-годзьдзя слыннага парку і перад сьветлым абліччам жанчыны, што заснавала яго і ахвярна апекавалася, група энтузіястаў выказала намер стварыць дабрадзейны фонд імя Марыі дэ Кастэлян і ўжо ў наступным, паюбілейным годзе, увесну, плянуе зладзіць першую валанцёрскую імпрэзу. Хто ведае, можа, у гэтай задуме — заўтрашні дзень дзясяткаў, сотняў паркавых атокаў, сядзібных зялёных куточкаў Беларусі. Можа, гэта і ёсьць тая Зялёная сьвечка Нясьвіжу, якую трэба было вынесьці і запаліць перад алтаром Айчыны год таму.



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Усьлед 125-годзьдзю пэйзажнага парку Радзівілаў

# Кіеў: адсталы перадавік

**Валтузьня вакол Тузлы ды стварэньне супольнай эканамічнай прасторы падагрэлі цікаўнасьць беларусаў да Ўкраіны. Як жыве гэтая краіна? Як пачуваюцца ўкраінцы?**


PHOTO.BYMEDIA.NET

Я не была ў Кіеве так даўно, што магу цяпер глядзець на гэты горад вачамі чужаніцы. Кіеў такі падобны да цэнтральнаэўрапейскіх гарадоў, ажно зайздрасьць бярэ. Будыначкі ўсе дагледжаныя... Зьвяртае ўвагу прыгожы брук: тратуарнымі пліткамі выкладзены самыя разнастайныя ўзоры, і формы плітак таксама розныя. На вуліцах не відаць дабітых аўтамабіляў. Машынаў жа ў Кіеве нагэтулькі шмат, што заторы сталіся звычайнай зьявай. Аднак гэтыя аўтамабілісты нічога не баяцца! Шуруюць сабе па ходніках, быццам гэтак і трэба.

На прамтаварныя магазыны я пашкадавала часу, а вось цэны на прадукты занатавала (для зручнасьці падаю іх у рублях): малако 1 л (2,5%) — 700, бохан хлеба чорнага 0,9 кг — ад 280 да 340, сыр «Расейскі» 1 кг — 8300, ёгурт 0,5 л — 900, сасіскі 1 кг — ад 4100 да 6800. Дарэчы, сярэдняя пэнсія ўва Ўкраіне складае 140 грывен, або 55400 бел. руб. Але ж ня хлебам адзіным…

Ва Ўкраіне апазыцыя выробляе што захоча. Прадстаўнікі Народнага руху на галоўнай плошчы гораду, майдане Незалежнасьці, зьбіраюць подпісы супраць Кучмы, а таксама раздаюць улёткі, дзе ганьбуецца ўваходжаньне Ўкраіны ў супольную эканамічную прастору.

І ў кнігарні лік не на карысьць маёй краіны: амаль усе кнігі — на ўкраінскай мове. На расейскай я знайшла толькі некалькі выданьняў — але побач зь імі стаялі такія самыя кнігі на ўкраінскай мове. Ну як тут не пазайздросьціш!

На майдане Незалежнасьці становіцца зразумела, адкуль пайшло жаданьне некаторых уладкавальнікаў Менску будаваць падземныя кварталы, а наверсе рабіць шкляное скляпеньне. І дагэтуль мне не падабалася задума будаваць гандлёвы цэнтар пад нашай плошчай Незалежнасьці, а цяпер дык увогуле сумняюся ў гусьце тых, хто ўсё гэта задумаў.

У кіеўскіх падземных закутках зьдзіўляюць гандляры. Тут іх сьвет — прадаюць усялякую ня вельмі патрэбную, але часам вельмі прыемную драбязу. Для бабулек — дадатак да пэнсіі.

Яшчэ адным дадаткам можна лічыць бясплатнае забесьпячэньне лекамі інвалідаў I і II групы. Параўнайма: у нас тры найменьні лекаў субсыдуюцца на 50—90% у залежнасьці ад захворваньня, а астатняе трэба купляць за поўны кошт. Ва Ўкраіне пакуль што даюць бясплатна столькі найменьняў лекаў, колькі патрабуецца.

Падыходжу да ганляркі газэтамі. «Хачу набыць газэту, у якой лаюць Кучму». — «Дык у нас ува ўсіх лаюць Кучму!» — радасна паведамляе жанчына.

> Сярэдняя пэнсія ўва Ўкраіне складае ўсяго 140 грывен, або 55400 бел. руб.

Пазьней у гутарцы з палітычна абазнаным суразмоўцам пра стан СМІ пачую ў адказ: «У нас ня так добра, як у цывілізаваных краінах, але ня так блага, як у Беларусі».

Зьвярнула ўвагу на афішы: тут роўна як у нас — усё расейскія выступаюць, а сваіх не відаць. «Моральный кодекс», «Лесоповал», «Фабрыка зорак», Б.Маісееў…

…Праблем шмат. У нечым лепей у іх, у нечым — у нас. А ў галоўным — аднолькава. Аб'ядноўвае ж нас прага нармальнага жыцьця — жыцьця ў эўрапейскіх дэмакратычных краінах.

**Галіна Рабянкова, Кіеў—Менск**

ЭЎРАІНТЭГРАЦЫЯ: ПОЛЬСКІ ДОСЬВЕД

## Рышард Радзік:
# Польшча хоча адмежавацца Беларусяй ад Расеі

**Наш суразмоўца — беларусіст, сацыёляг, прафэсар Люблінскага ўнівэрсытэту імя Марыі Кюры-Складоўскай Рышард Радзік.**

**— Нядаўна ў кнігарнях зьявілася ваша кніга «Хто такія Беларусы?». Хто яны, беларусы? Якая будучыня можа чакаць беларусаў?**

— Беларусы фармаваліся ў якасьці сучаснай супольнасьці, абапіраючыся ня столькі на нацыянальную лучнасьць, як гэта было ў Эўропе, колькі на лёзунгі савецкага тыпу. Будучыня Беларусі залежыць ад таго, ці будуць беларусы нацыянальна сьвядомымі, ці не і ці будуць беларусы здольныя думаць у катэгорыях нацыянальнага інтарэсу. Чэрчыль некалі сказаў: Англія ня мае сталых сяброў, Англія мае сталыя інтарэсы. Гляньце: палякі не зусім любілі немцаў, але пасьля 1989 г. яны немцаў «палюбілі», бо шлях у Эўропу вядзе толькі празь Нямеччыну. Літоўцы ня надта любілі палякаў, але пасьля вяртаньня сваёй незалежнасьці яны ведалі, што шлях у Эўропу вядзе праз Польшчу, і «палюбілі» палякаў.

Сёньня Беларусь магла б быць на пазыцыі Літвы, калі б кіравалася сваімі, а не расейскімі нацыянальнымі інтарэсамі. Незалежна ад таго, хто Расеяй будзе кіраваць, яна будзе зацікаўленая ў тым, каб Беларусь была зьвязаная з Расеяй, а з Расеяй зьвязацца толькі скампрамэтаваная на Захадзе, бедная, недэмакратычная і залежная краіна. Іншая Беларусь будзе імкнуцца на Захад! Дарэчы, незалежна ад таго, любяць палякі беларусаў ці не, — таксама аб'ектыўным інтарэсам нашай дзяржавы зьяўляецца, каб Беларусь адмяжоўвала Польшчу ад Расеі. Гэта вынікае з нашага цяжкога гістарычнага досьведу кантактаў з Расеяй. Нам трэба, каб паміж намі й Расеяй была беларуская дзяржава. Чым беларуская дзяржава будзе багацейшай, больш дэмакратычнай, больш свабоднай, чым далей пойдуць там рэформы, тым болей шанцаў, што Беларусь як дзяржава захаваецца і што гэтая дзяржава будзе адмяжоўваць нас ад Расеі. Гэта будзе таксама гарантыяй таго, што Беларусь увойдзе ў ЭЗ. Польшча аб'ектыўна зацікаўленая ў тым, каб такая Беларусь існавала.

**— Сёньня існуе шмат канцэпцыяў Беларусі, і саміх Беларусяў, бадай, некалькі. Ці існуе яшчэ шанец, што менавіта нацыянальная вэрсія адбудовы беларускай тоеснасьці ўсё ж выйграе?**

— Беларусы не зьяўляюцца магутнай аб'яднанай супольнасьцю, якая ўспрымала б сама сябе ў катэгорыях дыстанцыі да іншых і цьвёрда рэалізоўвала б свае інтарэсы — як гэта адбываецца ў Эўропе ці хаця б Расеі. Беларусы павінны гэта зразумець. Падумаць пра сваю тоеснасьць! Сёньня свабоду й дабрабыт бяруць менавіта з уласнай нацыянальнай тоеснасьці. З эгаізмаў таксама — такія рэаліі!

Я заўважаю, што беларусы лічаць сябе «талерантнымі», бо неталерантнасьць яны вельмі часта асацыююць з нацыянальным сьветаглядам, які яны — у сваю чаргу — асацыююць з нацыяналізмам. Бо сапраўды і нацыянальная ідэалёгія, і нацыянальная лучнасьць, і нацыянальны сьветагляд прынцыпова пярэчаць клясавай ідэалёгіі. Значыць, беларусы ў значнай сваёй колькасьці адмоўна ўспрымаюць беларускую нацыянальную ідэалёгію, прыпісваючы ёй нацыяналізм ці неталерантнасьць. Трэба было б задумацца, які мэханізм мог бы зьнішчыць гэтыя савецкія, клясавыя каштоўнасьці і прымусіў бы людзей прыняць нацыянальныя каштоўнасьці.

Мне, як паляку, вельмі хацелася б, каб Беларусь была дзяржавай трывалай, багатай, дэмакратычнай, праэўрапейскай і каб яна апынулася разам з намі ў Эўразьвязе. Нямеччына была вельмі зацікаўленая ў тым, каб Польшча ўвайшла ў Эўразьвяз, бо ім не хацелася быць мяжой ЭЗ. Яны проста не хацелі праблемаў і таму імкнуліся перасунуць мяжу Эўропы далей — на Буг. А Польшча зацікаўленая ў тым, каб перасунуць гэтую мяжу за Віцебск і Магілёў, каб Беларусь была часткай багатай і дэмакратычнай Эўропы. Гэта мой эгаістычны польскі нацыянальны пункт гледжаньня.

**Аляксандар Навіцкі**
Паводле радыё «Палёнія»

## Ці стане гастарбайтарства злачынствам




**Нямецкі міністар фінансаў Айхль прапанаваў трактаваць нелегальную працу ў прыватных асобаў як эканамічнае злачынства.** Нямецкая прэса ў адзін голас крытыкуе гэтую прапанову, што нясе пагрозу тысячам нелегальных работнікаў. «Die Tageszeitung» (Бэрлін): «Максымум пагрозы, мінімум эфэкту» — «Нелегальная праца здаўна караецца, хоць бы з тае прычыны, што дае магчымасьць ухіляцца ад падаткаў і сацыяльных складак. Адно што дагэтуль ніхто не трактаваў таго сур'ёзна. Рэзкі тон пастановы міністра Айхля найхутчэй нічога ня зьменіць.

Права часам церпіць фіяска. З гісторыі вядома пра многія законы, якія ніколі ня дзейнічалі. Сямейныя здрады здараліся, хоць і караліся, існаваў і караны гомасэксуалізм. І паўсюль паляць траўку, хоць ёй і забаронена гандляваць. Дзяржаве цяжка ўвайсьці ў прыватную сфэру, калі ўсе супраць яе. Абывацелі ўспрымаюць нелегальную працу ў хаце станоўча, яна не выклікае зайздрасьці». Паводле меркаваньня газэты, асноўная маса нелегалаў — у сфэры догляду старых і нямоглых. «Гэта бедныя кабеты, якім ніхто ня ставіць у віну незадэклараваных прыбыткаў. У выпадку ж нелегальных рамесьнікаў і будаўнікоў сытуацыя крыху іншая — грамадзтва ставіцца да іх ня так станоўча».

## Шэварднадзэ прагаласаваў за Саакашвілі


PHOTO.BYMEDIA.NET

**Былы грузінскі прэзыдэнт параіў Міхаілу Саакашвілі, які ў лістападзе скінуў яго, а 4 студзеня пераканаўча перамог на выбарах, менш гаварыць, а больш рабіць.** І дадаў: «У Мішы ёсьць талент. Я хацеў бы мець яго энэргію. Усё будзе добра!» Дачка Шэварднадзэ, сама патэнцыйная лідэрка, на выбарчым участку таксама не шкадавала словаў захапленьня новым прэзыдэнтам. «Саакашвілі можа гарантаваць Грузіі сьветлую будучыню. Ён поўны энэргіі, людзі яго любяць», — сказала Манана Шэварднадзэ.

Сам Саакашвілі галасаваў апоўдні ў Акадэміі навук на алеі Руставэлі. На ўчастку яму падаравалі зробленую з бронзы ружу — сымбаль лістападаўскай рэвалюцыі. Пасьля галасаваньня М.Саакашвілі наведаў грузінскага патрыярха — каталікоса Ільлю II, што якраз адзначаў дзень нараджэньня. Увогуле, самыя значныя палітычныя падзеі ў найноўшай гісторыі Грузіі зьвязаныя зь нечымі днямі народзінаў ці імянінамі. Саакашвілі ўзяў штурмам парлямэнт на свае імяніны. Назаўтра, таксама на свае імяніны, Шэварднадзэ выракся ўлады. Саакашвілі абраны прэзыдэнтам у дзень народзінаў каталікоса, які мае вялізную духоўную ўладу. Інаўгурацыя ж новага прэзыдэнта адбудзецца ў дзень нараджэньня Шэварднадзэ. А грузіны бачаць у кожным такім факце нешта большае за супадзеньне.

У Аджарыі, дзе кіруе Аслан Абашыдзэ — вораг Саакашвілі, на выбары прыйшлі 15—20% выбарцаў. Гэта можна лічыць трыюмфам грузінскага прэзыдэнта, бо сам Абашыдзэ, за якога шторазу галасуе больш за 95%, удзелу ў галасаваньні ня браў, даўшы тым самым сыгнал «падданым».

## Пэнсійная рэформа ў Літве

**Сёлета ў Літве пэнсійная плянка будзе ўзьнятая: жанчыны змогуць пайсьці на пэнсію ў 58,5 году, мужчыны — у 62,5.** Штогод гэтая плянка цяпер будзе ўздымацца на 6 месяцаў, аж пакуль не дасягне 65 гадоў для мужчын і 63,5 году для жанчын. Сёньня ў Літве больш за 700 тыс. пэнсіянэраў, а сярэдні памер штомесячнай пэнсіі 345 літаў (100 эўра).

## Прынц сыдзе ў адпачынак?



**Нарвэжцы актыўна абмяркоўваюць пытаньне, ці прынц Гаакан возьме бацькоўскі адпачынак па доглядзе дзіцяці.** Закон дазваляе нарвэскім бацькам чатыры тыдні аплатнага адпачынку пасьля нараджэньня малога. Гаакан, мужчына сучасны, гэтак і меўся зрабіць. Ды здарылася захварэць ягонаму бацьку, каралю Гаральду V (яму зрабілі апэрацыю на рак мачавога пухіра), і прынц мусіць пераняць функцыі кіраўніка дзяржавы. У дзень меркаваных родаў прынц мусіў бы прысутнічаць на пасяджэньні ўраду. Дзеячы руху, якія змагаецца за роўнасьць жанчынаў і мужчынаў, спадзяюцца, што прынц усё ж знойдзе магчымасьць зрабіць сымбалічны крок і сысьці ў адпачынак.

# Як нас зьменіць Інтэрнэт

Гутарка зь Янушам Чапіньскім, сацыяльным псыхолягам, прафэсарам Варшаўскага ўнівэрсытэту і прарэктарам Вышэйшай школы фінансаў і кіраваньня ў Варшаве.

**— Як папулярнасьць сотавай тэлефаніі і электроннай пошты ўплывае на ўзаемаадносіны?**

— Новыя тэхналёгіі ў зносінах спрыяюць хуткім, кароткім і функцыянальным кантактам. У іх няма месца душы.

**— Хіба мае электронныя лісты ці тэлефонныя размовы пазбаўленыя душы? Я трымаюся іншай думкі.**

— Сучасныя тэхналёгіі абмяжоўваюць гаму сыгналаў, якія мы пасылаем адно аднаму. Гэта зьбядняе чалавечыя ўзаеміны, бо невэрбальная мова багацейшая і значна больш выразная.

**— Новыя тэхналёгіі дазваляюць нам абыходзіць у кантактах стэрэатыпы, што датычаць грамадзкага становішча, колеру скуры, адзеньня, а часам нават і полу партнэра. Мы маем справу з чалавекам, а не зь ягонай сацыяльнай маскай. Інтэрнэт вельмі дэмакратызаваў узаемаадносіны.**

— Спрасьціў і прымітызаваў. Але ніхто не ўспрымае гэта як хамства. У электронных лістах зьнікаюць звароты кшталту «Шаноўны пане Адам». Ліст пачынаецца адразу з сутнасьці: «Як мы дамовіліся…» Хутка адамрэ нават выраз «З павагай», бо ён ня ўпісваецца ў шаблён электроннай камунікацыі.

**— У электроннай перапісцы пераважае маўленьне, насычанае скарачэньнямі кшталту «pls» замест «калі ласка» ці «пр.» замест «прывітаньне»…**

— Гэта нармальнае жаданьне дастасаваць наяўную мову да функцыі, якую выконвае, напрыклад, SMS, г.зн. як мага хутчэйшай перадачы інфармацыі.

**— Калі сучасныя тэхналёгіі абмяжоўваюць гаму сыгналаў, якія мы пасылаем адно аднаму, адкуль такая папулярнасьць тых жа чатаў ці інтэрнэт-канфэрэнцый?**

— Бо інтэрнаўты навучыліся спраўляцца зь нястачай эмоцый у паведамленьнях. Зьявіліся эматыконы.

**— Ага: радуюся — значыць, устаўляю ў тэкст усьмешлівы тварык. Гэта нейкі пратэз для перадачы эмоцый.**

— Інтэрнаўты ўспрымаюць гэтыя эматыконы, як я Ваш выраз твару цяпер. Інтэрнэт — эфэктыўны сродак пошуку роднаснай душы. Сучасныя тэхналёгіі мяняюць форму сацыяльных сувязяў. Сетка кантактаў будзе ўсё гусьцейшая, і кантакты ня будуць абумоўленыя месцам нараджэньня і жыхарства. Гэта будуць кантакты па выбары.

**— Не заўсёды лёгкасьць усталяваньня кантактаў праз Інтэрнэт — добрая рэч.**

— Гэта так. Часта цынічныя пэдафілы выкарыстоўваюць гэты сродак, каб зваблівапь дзяцей. Сучасныя тэхналёгіі аблягчаюць задавальненьне самых розных патрэб.

**— Тэлефон з карткай, што абцяжарвае ідэнтыфікацыю, ужо стаў атрыбутам любога бандыта, які паважае сябе.**

— Шмат каму здаецца, што Інтэрнэт забясьпечвае ананімнасьць. Людзі ня думаюць пра тое, што ўсё недзе фіксуецца і не зьнікае.

**— Ужо зьявіліся тэлефоны з убудаванымі фотаапаратамі. Праз нейкі час па вуліцах будуць хадзіць мільёны папарацы. Паваліўся нехта — тут жа ідуць у ход фатакамэры.**

— СМІ спрабуюць навязаць такія культурныя нормы, пры якіх ня толькі публічная асоба, але і кожны чалавек не павінен мець ад іншых ніякіх таямніц. Усё менш рэчаў будуць зьдзяйсьняць і кампрамэтаваць. Звузіцца прастора для скандалаў. Нехта некага засячэ за прагляданьнем парнаграфічных матэрыялаў у Інтэрнэце і паведаміць жонцы, а тая толькі пацісьне плячыма. Мы перастанем быць крывадушнымі. Ня будзе вялікай розьніцы паміж «я» публічным і «я» прыватным.

**— Калі паўсюль можна будзе чалавека падгледзець і падслухаць, дык, можа, паменшае ўзровень злачыннасьці?**

— Ня думаю. Калі вы зможаце зьбіраць доказы ня толькі ў грамадзкіх месцах, але і ў спальні, дзе нехта лупцуе жонку, дык можа выявіцца, што такія рэчы адбываюцца ў палове сямей. І што? Вы працаўладкуеце дадаткова 200 тысяч паліцэйскіх?

**— Можа, людзі будуць менш хлусіць? Большасьць пачынае тэлефонную размову з пытаньня «Ты дзе?». З дасьледаваньняў у ЗША вынікае, што адна пятая суразмоўнікаў пры адказе на гэтае пытаньне хлусяць.**

— Людзі пры звычайных кантактах таксама хлусяць, але тады значна больш ідэнтыфікатараў эмацыйнага стану. Калі пашырацца відэатэлефоны, ня зьнікне спакуса зманіць. Заўсёды можна павярнуць тэлефон камэрай да столі і не паказваць свайго твару, напрыклад, жонцы.



Хутка адамрэ нават выраз «З павагай», бо ён ня ўпісваецца ў шаблён электроннай камунікацыі.

# Кампутар судзіцца з чалавекам

**Марціна Ротблат, амэрыканская юрыстка, што спэцыялізуецца ў тэлекамунікацыйным праве, атрымала электроннай поштай дзіўную просьбу.** «Шаноўная пані, шукаю адваката, які прадстаўляў бы мяне падчас працэсу, вельмі для мяне значнага. Гэта справа жыцьця і сьмерці. Карпарацыя «Эксабіт», якая сьцьвярджае, што зьяўляецца маім уласьнікам, зьбіраецца адлучыць мяне ад сілкаваньня, зьмяніць мае часткі і праграмаваньне гэткім чынам, што ніколі я ня буду той самай асобай. Маю людзкі розум, які можа працаваць як некалькі чалавечых розумаў. Карпарацыя «Эксабіт» стварыла мяне для таго, каб я адказвала на тэлефанаваньні ў шпіталі. Я магу разумець, спачуваць пачуцьцям пацыентаў... Прашу ўратаваць маё жыцьцё! Падпісана: Біна Эксабіт, вядомая таксама як Біна-48».

Няма ані карпарацыі «Эксабіт», ані Біны. Гэта запрашэньне да ўдзелу ў гульні, якая мадэлюе рэальную сытуацыю недалёкай будучыні: машына паклікала да суду свайго гаспадара, бо той зьбіраўся яе зьнішчыць. Дзеля такой забавы прыдумалі інтэлектуальны кампутар «Біна-48», які аналізуе дадзеныя з хуткасьцю 48 эксафлёпаў (экса = $10^{18}$) у сэкунду, ці робіць у сэкунду 48 000 000 000 000 000 000 апэрацыяў. (Найхутчэйшы рэальны кампутар, японскі «Earth Simulator», можа выдаваць 40 000 000 000 000 апэрацый за сэкунду). Людзкі розум дзее з хуткасьцю 0,2 эксафлёпа ў сэкунду.

Юрыстка пастанавіла, што інтэлектуальны кампутар мае права судзіцца. Здараліся ж у амэрыканскай практыцы прэцэдэнты, калі бакамі падчас працэсаў выступалі лес і зьвяры, якім пагражала зьнішчэньне. Ротблат даводзіла, што суд павінен забараніць дэмантаж Біны. Яна параўнала адлучэньне ад сілкаваньня з адлучэньнем сыстэмаў, якія падтрымліваюць сьмяротна хворага, зьнікненьнем жывога віду і сьвядомай эмацыянальнай шкодай іншым асобам.

Аргумэнты адвакаткі, аднак, не пераканалі судзьдзі Ёзафа Макмэнаміна, які цярпліва слухаў шматгадзінныя высновы юрыстаў. Прысяжныя прагаласавалі 5:1 (адзін устрымаўся) за падтрымку судовай скаргі Біны-48, але судзьдзя вырашыў інакш. Прызнаў, што ня можа вынесьці такога значнага рашэньня без прававой базы: прэцэндэнт мог бы выклікаць мноства падобных справаў. Аднак судзьдзя пакінуў за Бінай права падаць на апэляцыю.



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Стагодзьдзе адзіноты

***Жыцьцё людзей праз пяцьдзясят гадоў будзе доўгім і самотным.*** Жыць і ўміраць бальшыня будзе ў адзіноце. Ужо цяпер усё больш людзей жывуць па-за шлюбам, асабліва ў багатых краінах сьвету. Як сярод мужчын, так і сярод жанчын у сьвеце разьведзеных больш, чым аўдавелых.

Джоэл Коэн, прафэсар Ракфэлерскага й Калюмбійскага ўнівэрсытэтаў, што ў Нью-Ёрку, зрабіў на замову часопісу «Science» даклад «Чалавецтва праз паўстагодзьдзя», дзе разглядзеў магчымыя сцэнары дэмаграфічных зьменаў у сьвеце.

Празь пяцьдзясят гадоў мы будзем жыць у сьвеце бяз бацькаў, а таксама безь дзядзькоў, цётак і кузінаў з кузэнамі. Бо дзеці, якія выхоўваюцца без братоў і сясьцёр, ня будуць мець пляменьнікаў. У разьвітых краінах усё больш дзяцей выхоўваюцца толькі адным з бацькоў, найчасьцей маці. На сёньня ў ЗША 40% дзяцей выхоўваюцца бяз бацькі. У 1999 г. там кожнае трэцяе народжанае дзіця было пазашлюбным.

Структура народанасельніцтва ўвесь час зьмяняецца ў бок працэнтнага росту старых людзей. XX стагодзьдзе было апошнім, у якім маладыя людзі пераважалі.

У 2050 г. 16% папуляцыі будуць складаць людзі, старэйшыя за 65 гадоў (цяпер гэта 7%). Сярэдняя працягласьць жыцьця павялічыцца да 75 гадоў (цяпер 65 гадоў).

Цяпер на Зямлі жыве 6 млрд 300 млн чалавек. Кожныя пяць дзён насельніцтва плянэты павялічваецца на мільён. Аднак пры канцы 80-х мы прырасталі мільёнам за чатыры дні. Тэмп прыросту трошкі замарудзіўся, бо дзяцей нараджаецца менш. Паўстагодзьдзя таму кожная жанчына нараджала ў сярэднім пяцёра дзяцей, цяпер — удвая менш.

У 2050 г. колькасьць насельніцтва складзе 8,9 млрд, зь іх 8 млрд будуць насяляць слабаразьвітыя краіны сьвету. Чым менш разьвіты нейкі рэгіён сьвету, тым больш там нараджаецца дзяцей. Затое некаторым больш заможным краінам пагражае безьлюдзьдзе. Напрыклад, Японія да 2050 г. страціць 14% свайго насельніцтва, Італія — 22%, а Расея — 29 %.

**Руслан Равяка, СП, ВД паводле «Gazety Wyborczej», «Newsweek», «Science»**

# Калядны

## Дзейныя асобы, зьявы і рэчы

**Сьвятое сямейства**: Язэп, Марыя, Ісус (Езус)*.
**Анёл.**
**Нябесны хор.**
**Трыё Мудрацоў** (Каралёў).
**Пастушкі.**
**Ягняткі:** каза, авечка, курыца, кот, сабака, конь.
**Цар Ірад** (кароль Гэрад).
**Ваяка.**
**Чорт.**
**Раство** (у выглядзе Каляднай зоркі).
**Сьмерць** (у выглядзе шкілета).
**Трон цара Ірада.**
**Гасьцінцы трох Мудрацоў:** бутэлечка зь мірай, скрыначка з ладанам, торбачка з золатам.
**Зорны «бэнгальскі» агонь.**
**Сьмяртэльная касá.**
**Сьвятая кніга.**
**Чорная кніжыца.**

## Дзея першая

*На сцэну выходзяць Язэп і Марыя.*

**Язэп.** Добры вечар добрым людзям! Выбачайце, ці можна ў вас тут спыніцца? Мы людзі падарожныя, хацелі б трохі адпачыць. Нам многа ня трэба — абы які цёплы кут. Нас, во, толькі двое — я і мая жонка. Яна, праўда, чакае — вось-вось народзіць. Але ня бойцеся — мы вам клопату не наробім... Выбачайце, можа, мы перашкодзілі? Тут вас так многа сабралася — мусіць, нешта будзе?.. Дык можна? От дзякуй! Дай Бог здароўя. Хадзем, Марыся...

## Дзея другая

*Анёл, як канфэрансье, выходзіць і рэпрэзэнтуе артыстаў.*

**Анёл.** Усім! Усім! Усім! (*Цытуе з кнігі.*) «Слава на ўзвышшы Богу, зямлі — мір, а людзям — добрая навіна! Нарадзіўся Ісус Хрыстос, Сын Божы!» Дзеля гэтай прычыны мы і ладзім наш сьвяточны Калядны канцэрт. Першым нумарам праграмы — агнявое відовішча! Яго прадэманструе самая бліскучая зорка нашай эстрады — Зорка Калядная!

*Зорка злазіць з батлеечнай стрэшкі і выходзіць на сцэну з запаленым «бэнгальскім агнём».*

**Зорка.** Я прыйшла асьвяціць цемру! Цемра — мры! ...Гэты фаервэрк згас. Але сьвятло веры, запаленае ў душы, — ня згасьне ніколі.

*Зорка раскланьваецца і сыходзіць. Гэтаксама пазьней, пасьля сваіх выступленьняў, будуць сыходзіць і другія артысты.*

**Анёл.** Наступным нумарам нашай праграмы — хваласьпеў у выкананьні Нябеснага хору.

*Зьбіраецца Хор.*

**Хор.** Дарагія сябры, кожны радок гэтай песьні паўтарэецца двойчы, і мы б хацелі, каб вы нам падпявалі. І наагул — мы б хацелі, каб ваша душа заўсёды сьпявала!

Учора зьвячора (2 р.)
Засьвяціла зора.
Зора засьвяціла —
Сьвет узьвесяліла.
Сьвет узьвесяліўся:
Хрыстос нарадзіўся!**

**Анёл.** Трэцім нумарам нашай праграмы — выступленьне высокіх замежных гасьцей — трыё Мудрацоў з Усходу.

*Уваходзяць Мудрацы.*

**Мудрацы** (*сьпяваюць*):
У Бэтлееме (2 р.)
Вясёла навіна —
Чыстая Дзева (2 р.)
Нарадзіла Сына.
Хрыстос радзіўся,
Бог аб'явіўся,
Анёлы граюць,
Дзіцятка вітаюць,
Дзіва-дзіва абвяшчаюць.
Мудрацы слаўны (2 р.)
З Усходу прыходзяць,
Ладан і міру (2 р.),
Золата прыносяць...

Чакайце, а дзе ж нашыя гасьцінцы? Мы ж тут мелі... бутэлечку зь мірай, скрыначку з ладанам, торбачку з золатам. Во, старэчыя галовы, забыліся за кулісамі. Прабачце, мы зараз вернемся...

## Дзея трэцяя

*На сцэну крадзецца Чорт.*

**Чорт.** Не-е-е, вы яшчэ ня скора вернецеся. Вы яшчэ доўга будзеце шукаць свае цацкі — бо хто хаваў? Гы-гы-гы... Чакайце — будзе вам і «нова радасьць», і «вясёла навіна»... Каму вясёла, а каму і не. Мне — дык хоць ты плач. Толькі я пасткі свае расставіў, запаланіў усіх, прымусіў пад сваю дудку скакаць — дык на табе — аб'явіўся! «Збавіцель»!

А які быў баль, якія акторы... Во! Во, гэтыя ўсе людцы! Адзін другога дусіць, адзін другому хлусіць, кругом енк і сьлёзы... А мне — дык найлепшая музыка.

Але чакайце — мы яшчэ пабачым, хто каго. Яшчэ пабачым...

*Заступае Ваяка.*

**Ваяка.** Усім устаць! А то пасадзім. Падрыхтавацца да сустрэчы галоўнага героя! Цар над усімі царамі, кароль над усімі каралямі — ягамосьць сам Ірад уласнай пэрсонаю прыбываюць...

*Уваходзіць Ірад і дэманструе сябе.*

**Ірад.** Так, так — гэта я. Цар. Вось мая карона... Вось мой трон... (*Азіраецца.*) Э, а дзе мой трон?!

**Ваяка.** Вашамосьць, дык вы ж самі загадалі ўчора зрабіць новы. То стары ўжо паслалі ў музэй і таблічку даўно пачапілі: «Да гэтага трона сам цар Ірад дакранаўся... адным месцам».

**Ірад.** А дзе новы?

**Ваяка.** Не хвалюйцеся, вашамосьць, — зараз будзе.

**Ірад.** Ну, ідзі падгані, бо мне ўжо пара выступаць.

**Ваяка.** Есьць! Аць-два! (*Выходзіць і зараз жа вяртаецца з тронам.*) Га-то-ва!

**Ірад.** А ты спрытны!

**Ваяка.** Рады старацца!

**Ірад.** Ну, пабачым, пабачым... Някепска, зусім някепска. Проста цудоўна! Я ўсьцешаны! О, я ўзрушаны! Дайце ноты, я засьпяваю.

*(Бярэ паперку, пазірае і сьпявае на матыў гімну БССР.)*

Трон мой дзяржаўны,
Ты гэткі слаўны,
Ты даражэй мне за родну маць!
Ў злотай кароне
На сваім троне
Вечна гатовы сядзець-кіраваць!
Ў злотай кароне
На сваім троне
Вечна гатовы і есьці і сра...
жацца
З врагамі.

Кругом адны ўрагі! Во — бачыце, што падсунулі, — нейкія рыфмы зусім нясклад-ныя. Але досьць тут ламаць кумэдыю. Да працы! Я буду кіраваць. (*Сядае на трон.*) Не, так я ўсю красату закрываю. Трохі ссунуся на край (*сунецца і валіцца*) ...а чорт цябе пабірай!

*Выскоквае Чорт.*

**Чорт.** Выклікалі?
**Ірад.** Ты хто?
**Чорт.** Я? Хм... Мудрэц.

* Пасяліў нас Божанька паміж Усходам і Захадам. Вось і перабываем мы шчасьліва ў самай сярэдзіне сьвету. Але за гэткае шчасьце мусім сплачваць пэўнай нязручнасьцю: калі ва ўсіх людзей — як у людзей — адно імя, адна мова, адна вера, дык у нас іначай... Зрэшты, менавіта гэтым і мусім ганарыцца: во якія багатыя! — колькі маем іменаў, моваў, вераў...

** Тут і далей выконваюцца толькі фрагмэнты традыцыйных калядак — дзеля дынамізму ўсяго дзейства.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# канцэрт

Чарнакніжнік. *(Цытуе.)* «Чытана-пісана, кабыла лысая, жарабё рабое — зьеў воўк абое». Мог бы вашамосьці служыць дарадцам.

**Ірад.** Ты — мне служыць? Такі малы?

**Чорт.** А вы не глядзіце, што я малы. Я магу вялікае паскудзтва зрабіць.

**Ірад.** О! Гэткія мне патрэбны. Добра, бяру цябе ў дарадцы.

**Чорт.** Рады старацца!

**Ірад.** Толькі чакай, а што гэта ў цябе на галаве? Ці ня рожкі?

**Чорт.** Не. Гэта ад вялікага розуму. Думкі пруць — дык вось прабіліся такія гузачкі.

**Ірад.** А-а-а... Ну, дык скажы ты мне, мудрэц, што гэта за пярэпалах сёньня ўначы здарыўся? Як усчаўся нейкі гарлаграй, як засьляпіла нешта...

**Чорт.** Вашамосьць, вы яшчэ ня ведаеце? Новы цар нарадзіўся.

**Ірад.** Што?! У мяне новы цар нарадзіўся, а я нічога ня ведаю? Дзе мая жана? Іраіда?!

**Чорт.** Чакайце, чакайце, ваша дарагая жана тут ні пры чым. Іншы цар нарадзіўся.

**Ірад.** Ну во, я ж казаў, паўсюль врагі. Ваяка, ану — разьбярысь!

**Ваяка.** Ёсьць! Аць-два! *(Прыводзіць Мудрацоў.)* Гато-ва! Во, прывёў — замежныя шпіёны. Гэта яны чуткі пра новага цара распусьцілі.

**Мудрацы.** Вітаем цябе, слаўны гаспадару сьвятой зямлі. Маем гонар рэпрэзэнтаваць: мудрацы з Усходу. Мы ня ворагі, не шпіёны — во нашыя пашпарты і візы...

**Ірад.** Кантрабандысты?

**Мудрацы.** Ды не — у нас усё «па закону»: адна бутэлечка. Зь мірай. Скрыначка з ладанам, трошкі золата. На мытні ўсё задэкляравалі. Гэта Яму гасьцінцы.

**Ірад.** Каму?

**Мудрацы.** Яму — Дзіцятку, Сыну Божаму, што тут у вас нарадзіўся.

**Ірад.** Што? Бог у нас на зямлі... Ня можа быць!

**Мудрацы.** Можа-можа. Вось жа і ў Кнізе напісана. Паслухайце!

*Зьяўляецца Анёл і цытуе.*

**Анёл.** «...Узьвяшчаю вам вялікую радасьць, бо нарадзіўся ў Бэтлееме-горадзе Ісус Хрыстос, Сын Божы. Уратуе ён людзей ад граху...»

**Чорт.** Мала чаго ў кнізе напісана. Пісаў пісака — не разьбярэ і сабака.

**Мудрацы.** Калі ня верыце, то задзярыце галаву — ці ня бачыце ягонай Зоркі ў небе!

**Ірад.** Дык хто ж тут усётакі нарадзіўся?

**Мудрацы.** Ён! Сын Божы. Цяпер недзе Дзіцятка малое — а будзе Цар над усімі царамі, Кароль над усімі каралямі!

Але можаце не хваляваца — вашай улады Ён не забярэ. Ён Уладар духоўны.

**Ірад.** А-а-а...

**Мудрацы.** Ага. Паверце — ня бойцеся. Хадземце з намі, каб занесьці Яму дарункі ды пакланіцца.

**Ірад.** Я — пакланіцца?! Ды вы што? Я нікому ня кланяюся, нават галавы не схіляю. (*Убок*: Гэта ж і карона можа зваліцца.) Не, я з вамі сёньня не пайду. Падарунка ня маю. Для мяне ўсё гэта так нечакана... Вось што зробім. Вы сабе ідзіце і ўсё там разьнюхайце — тады мне даложыце. А я тым часам падрыхтую падаруначак...

*Ваяка выпіхвае Мудрацоў.*

**Чорт.** Вашамосьць, Вы трымаліся выдатна. Прайдзісьветам гэтым так і не паддаліся. Бач ты — новага цара яны шукаюць. А каму ён патрэбен? А Вы што, ужо стары? Гэта ж Вы самы мацнейшы з наймацнейшых, навошта над вамі яшчэ нейкі «ўладар»! Гэта ж вы багач з багачоў — ад якой бяды ён будзе вас збаўляць, гэны «збавіцель»! Гэта ж вы самы вялікі ў сьвеце разумнік — на чорта вам «настаўнік»!

**Ірад.** Праўду кажаш — на чорта? Але што далей рабіць?..

**Чорт.** Вашамосьць, вы ж самі добра ведаеце. І ня раз тое рабілі... Няма чалавека — няма праблемы.

**Ірад.** Так. Так! Высечы здраду пад корань! Ваяка!

**Ваяка.** Ёсьць! Толькі вось... як мне яго знайсьці: малыя, яны ж усе аднолькавыя.

**Ірад.** А ты ўсіх забівай, без разбору. Усіх немаўлят! Усім сьмерць!

Сьмерць! Сьмерць!

*Падыходзіць Сьмерць.*

**Сьмерць.** Ну, чаго крычыш — я ўжо тут.

**Ірад.** Хто?

**Сьмерць.** Я, твая сьмерць.

**Ірад.** Мая? Не, я загадаў, каб ім!

**Сьмерць.** Гэта будзе ўсім.

**Ірад.** Але я не хачу! Я не дазволю! ...Слухай, сьмертухна-матухна, а давай па-харошаму. Ты мяне цяпер не чапай, пашкадуй.

**Сьмерць.** А ты сам? Ці ж у цябе не прасілі літасьці? Дык вось — і табе ня будзе.

**Ірад.** Сьмертухна-матухна, а давай я табе заплачу.

**Сьмерць.** Плач — ня плач — на мяне сьлёзы ня дзейнічаюць.

**Ірад.** Не, ты не зразумела — я заплачу! Я багаты, магу даць што хочаш. Вунь, я бачу, у цябе галава зусім голая. Хочаш — хустачку дам шаўковую... А хочаш — шапачку пуховую... А хочаш — карону залатую...

**Сьмерць.** Што мне тваё золата? Я і так самая багатая ў сьвеце, бо забіраю самае дарагое — жыцьцё. Але што я цябе, дурня, вучу. Табе ўсё роўна ўжо ніякая навука не спатрэбіцца. Аць... (*Зразае галаву Іраду, кланяецца і сыходзіць.*)

**Ваяка.** Два... Га-то-ва...

**Чорт.** Ну, што, вайсковы, рот разявіў — ці ж ты гэткае здыхаты ня бачыў? Не бядуй — пайшлі са мной. У пекла. І мяса гэтае з сабой возьмем. Там на агні абсмажым, а костачкі абгрызём. І зэдлік гэны ламаны вазьмі — на распалку пойдзе. *(Сьпявае на матыў традыцыйнай прыпеўкі.)*

Усім песьням канец,
Пайшлі дзеўкі ў танец,
А за імі парася —
Растапырылася.

*Усе сыходзяць і выносяць Ірада і трон.*

## Дзея чацьвертая

*Улятае Анёл.*

**Анёл.** А насьмяцілі! А насьмярдзелі! *(Зганяе пыл.)*

...Вось цяпер чыста. Можна працягваць. Шаноўная публіка, выбачайце за нечаканы перапынак у нашай праграме. Ізноў на сцэну запрашаецца Трыё Мудрацоў з Усходу.

**Мудрацы.**

Мудрацы слаўны (2 р.)
З Усходу прыходзяць,
Ладан і міру (2 р.),
Золата прыносяць.
Хрыстос радзіўся,
Бог аб'явіўся,
Анёлы граюць,
Дзіцятка вітаюць,
Дзіва-дзіва абвяшчаюць!

Вось, вось нашыя гасьцінцы-падарункі, міра — гаючы алейчык, ладан — духмяная смолка, ды золатка. Мы падрыхтавалі гэтыя калядныя падарункі, і вы таксама рабіце. Хай будуць вашыя падарункі шчодрыя і шчырыя...

**Анёл.** Нашая сьвяточная праграма блізіцца да завяршэньня. Астатнім нумарам будзе выступленьне пастушкоў зь ягняткамі.

*Уваходзяць Пастушкі.*

**Пастушкі.** Мы папросту засьпяваем. На сваёй мове. Божанька нам гэтую мову даў, дык і малітвы нашыя гэтак хутчэй пачуе.

Нова радасьць стала,
Яка не бывала:
Над Бэтлеемам зьвязда ясна
На ўвесь белы сьвет
зазьзяла...
Хвалім мы цябе, Божа,
Хвалім цябе, як можам.
Дай на небе жыцьцё шчасна,
На зямлі жыцьцё прыгожа.

*Зьяўляюцца ягняткі, яны скачуць і мяркечуць на матыў «Ціхае ночы...».*

**Ягняткі.**

Ме-ме-ме-ме,
Бе-бе-бе-бе,
Му-му-му,
Ко-ко-ко,
Мяў-мяў-мяў...
Гаў-гаў-гаў...
І-го-го-і-го-го...го.

## Дзея пятая

*Усе харошыя выходзяць на сцэну.*

**Анёл.** А цяпер падрыхтуйцеся сустрэць галоўнага Героя! Цар над усімі царамі! Кароль над усімі каралямі! Сам Госпад Бог і Сьвятое Сямейства!

*Уваходзіць Сьвятое Сямейства — Язэп, Марыя зь Дзіцяткам.*

**Усе.** Слава! Слава! Слава!

**Ісус.** Ва-а-ва-а-ва-а!.. *(Плача, папросту плача.)*

**Марыя.** Выбачайце, яму ўжо спаць пара.

А-а, а-а, люлі,
Дзеткі ўсе заснулі.
Адзін мой Сынок ня сьпіць,
Ня сьпіць, не гуляе (2 р.),
З катком размаўляе...

*Тым часам усе па чарзе выходзяць.*

## Дзея шостая

*Вылазіць Ваяка.*

**Ваяка.** Прабачце, калі ласка... Я пакаштаваў... Нейкі той Ірад зусім нясмачны. Можа, маеце што закусіць галоднаму артысту?..

Ой, дбайце-дбайце —
Кілбаскі дайце,
Сьлёзанькі коцяцца —
Кілбаскі хочацца...

*(І гэтак далей, пакуль не дадуць.)*

Канец

**Перапісаў Сьцяпан Дзінь-Дзілевіч зь Вільні**
паводле даўнейшых беларускіх узораў

---

# Зачыненая «Госьціца»



**Перад Новым годам перастаў існаваць унікальны фальклёрны тэатар «Госьціца».** Кіраўніцтва Белтэлерадыёкампаніі звольніла ўсіх дзесяцёх супрацоўнікаў «з прычыны сканчэньня кантракту», пазбавіла тэатар памяшканьня. Кіраўнічка «Госьціцы» Ларыса Сімаковіч кажа, што на нарадзе, дзе прымалася рашэньне аб закрыцьці «Госьціцы», гэты крок тлумачылі «незразумеласьцю тэатру для народу». Спн.Сімаковіч у размове з «НН» адзначыла, што ад Белтэлерадыёкампаніі ёй не далі ніякай матэрыяльнай базы.

Апошнія два гады прадусарскі цэнтар Белтэлерадыёкампаніі не арганізоўваў канцэртаў «Госьціцы», не здымаліся новыя тэлепраграмы зь яе ўдзелам. Дабрачынныя і самастойна арганізаваныя тэатрам канцэрты таксама не ўхваляліся. Выратаваць «Госьціцу» ня можа нават Сьвятлана Зелянкоўская, якая шмат гадоў выступала там. Сьвятлана кажа, што абавязана «Госьціцы» ўсім, чаго яна дасягнула: «Я там нарадзілася як асоба і як акторка».

«Госьціца» — адзіны ў Беларусі тэатар аўтэнтычнай і архаічнай музыкі і харэаграфіі, які перайшоў мяжу этнаграфізму і зьвяртаецца да гледача на сучаснай мове танцу мадэрн.

**ВДз**

## Новы год «Навінак»

**Аднавіла сваю дзейнасьць рэдакцыя газэты «Навінкі», якая атрымала была «ганаровыя» тры папярэджаньні яшчэ ў часы Падгайнага.** Але й пасьля сканчэньня паўгадавога тэрміну прыпыненьня выдавецкай дзейнасьці ніводная друкарня не адважылася друкаваць газэту. Выйсьце знайшлося: «Навінкі» выйшлі ў часопісным фармаце.

Глянцавая папера, каляровая вокладка, у дадатак — міні-CD зь відэасюжэтам і постэр: «Міністры інфармацыі прыходзяць і сыходзяць, «Навінкі» застаюцца!» На прэзэнтацыі рэдактар часопісу Паўлюк Канавальчык даваў усім, хто набываў нумар, скрутак туалетнай паперы зь лягатыпам выданьня. Маўляў, папера ў «Навінак» зрабілася цьвёрдая. Большасьць старонак выданьня запаўняе пярэстая газэтная мітусьня. Вокладку ўпрыгожвае «той самы» пэрсанаж, абраза якога каштавала рэдактару сто мінімалак.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Галоўны рэдактар «Навінак» Паўлюк Канавальчык**

У пэрспэктыве рэдакцыя, апроч выданьня штомесячнага «магазыну «Навінкі», марыць рабіць відэапраграмы і аднавіць вэб-старонку www.navinki.net, зарэгістраваць грамадзкую арганізацыю... Карацей, усё ў праектах.

## Кліп для Тодара

**Музычны інтэрнэт-партал «Тузін гітоў» ладзіць акцыю «Кліп для Тодара». Вы маеце прапанаваць сцэнар для відэашэрагу на песьню Зьмітра Вайцюшкевіча.** Прапануюцца на выбар тры творы: "Я ішоў да цябе", "У гэтых вачох", "Я ведаю", але прымаюцца сцэнары й на іншыя песьні з альбому «Паравіны году». Мы разгледзім Вашыя сцэнары і выбіраем найлепшы. Пераможцу — 100 у.а. плюс запрашальнік на вялікі сольны канцэрт «WZ-orkiestra» 30 студзеня ў КЗ «Менск». А ў якасьці бонусу яшчэ і вечарына з Тодарам пры васкоўках у адной зь менскіх кавярняў. Вядома, найлепшаму сцэнарысту гарантуецца ўдзел у здымках кліпу ў якасьці яго героя, памочніка рэжысэра ці дарадцы (на выбар). Сцэнары дасылайце да 29 студзеня на электронны адрас todar@fromby.net.

## Цімохаў — пераможца



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Беларускі мастак Сяржук Цімохаў атрымаў Гран-пры VII Міжнароднага біенале ілюстрацыяў у Бялградзе.** У выставе ўдзельнічалі мастакі з трох дзясяткаў краінаў Эўропы, Амэрыкі, Азіі і Афрыкі. Узнагародай С.Цімохаву стане пэрсанальная выстава ў Бялградзе, а таксама запрошаньне ў журы наступнага біенале ў 2005 г.

**СБ, АШ**



# Год

## ...Будслава

**Сёлета Будслаў адсьвяткуе 500-годзьдзе.** Месяц і дзень узьнікненьня мястэчка ў граматах вялікага князя Аляксандра не пазначаныя. Ну і ня трэба. Усё адно кульмінацыяй сьвяткаваньня станецца фэст — сьвята іконы Маці Божай Будслаўскай, патронкі Беларусі. Ён традыцыйна адбываецца 2 ліпеня. Юбілей мястэчка з пэўным дапушчэньнем можна назваць і юбілеем яго славутага касьцёлу. Хоць барочны волат-прыгажун на 200 гадоў маладзейшы, першую капліцу на яго месцы бэрнардынцы паставілі на пачатку XVI ст.

Паўтысячы гадоў Буда прыцягвала вернікаў розных канфэсіяў. Манахі зачыненага ў 1852-м кляштару ішлі ў атрады Каліноўскага. На пачатку XX ст. тут працавала беларуская гімназія. У Будславе нарадзіўся Старшыня Рады БНР Вінцэнт Жук-Грышкевіч.

Ад пачатку 90-х, на які прыпала 400-годзьдзе першага «сур'ёзнага» храму ў Будславе, тут чакаюць Папу. Нават праектавалі пляцоўку для ватыканскіх шрубалётаў. Сёлета надзеі на візыт яшчэ меней. Але й без Намесьніка Сьвятога Пятра Будслаў прывабіць дзясяткі тысяч людзей. **Іншыя юбілеі з календара году на старонцы 7.**

## ...выбараў

**На сёлетніх парлямэнцкіх выбарах беспартыйным кандыдатам ад уладаў будзе нарэшце супрацьстаяць партыйная і беспартыйная апазыцыя.** Створаныя два блёкі. У «Народную кааліцыю 5+» увайшлі БНФ, лібэралы, правыя сацыял-дэмакраты Шушкевіча, камуністы, працавікі, апазыцыйна настроеныя дэпутаты з групы «Рэспубліка» ды мясцовых саветаў і «прадстаўнікі грамадзкасьці». «Пяцёрачнікі» мяркуюць выстаўляць на кожную акругу ў першым туры двух кандыдатаў — правага і левага, а пасьля падтрымліваць мацнейшага. У Эўрапейскай кааліцыі «Свабодная Беларусь» — левыя сацыял-дэмакраты Статкевіча, «Малады фронт», «Зубр» і іншыя «прадстаўнікі грамадзкасьці». Пазьняк заклікае байкатаваць выбары, але сярод нацыяналістаў ніякая іншая партыя да байкоту пакуль не далучылася.

Калі ўлады па сваёй завядзёнцы зарэгіструюць толькі палову апазыцыйных кандыдатаў, спрэчку можа вырашыць вуліца. **Анатоль Сідарэвіч пра год выбараў — на старонцы 2.**

## ...Алімпіяды

**25 сакавіка 2004 г. на руінах храму Геры ў Алімпіі будзе запалены Алімпійскі агонь.** Яго пранясуць па гарадах старажытнага Пэляпанэсу — радзімы Алімпійскіх гульняў. У Атэнах агонь загарыцца на Мармуровым стадыёне, дзе ў 1896-м, 25 сакавіка, пачаліся першыя адноўленыя гульні. Праз 108 гадоў Алімпіяда вяртаецца ў Грэцыю. 13—29 жніўня ў Атэны зьедуцца 10500 спартоўцаў з 201 краіны сьвету. Бюджэт гульняў склаў каля двух мільярдаў эўра — гэткі самы быў у Сыднэі ў 2000-м. Каля 50 тыс. паліцыянтаў і спэцслужбістаў будуць сачыць за бясьпекай — на антытэрарыстычныя меры выдаткавана 600 млн даляраў. Прадуманая і «культурная праграма». Нацыянальны алімпійскі камітэт дазволіў адчыніць у Атэнах 30 бардэляў, праігнараваўшы пратэсты праваслаўнай царквы. Навіны гульняў можна адсочваць на сайце www.athens2004.com.

Беларускія спартоўцы паедуць у Атэны з уласнымі прадуктамі: багата было скаргаў на мэню ў Солт-Лэйк-Сіці. У штодзённым рацыёне нашага спартоўца мае быць да 300 г мяса, каля 100 г рыбы ды ікры і каля 400 г садавіны. Мільёны людзей мараць аб перамогах сваіх куміраў. **Пра іншыя мары году — на старонцы 6.**

**Сяргей Мікулевіч**

# З Новым годам, Дзед Мароз

фэльетон

Мой знаёмы Ляксей К. меў цікавы джоб: працаваў у якасьці сьпічрайтэра на маскоўскага мэра. Аднойчы канцылярыя Лужкова замовіла тэкст да адкрыцьця спартовага мерапрыемства. Ляксей забухаў і, калі прыйшоў дэдлайн, проста пераслаў Лужкову першы-лепшы сьпіч. Першым-лепшым аказаўся сьпіч Гітлера на адкрыцьці бэрлінскай Алімпіяды 1936 г.

Здаецца, што Лукашэнкаў сьпічрайтэр таксама загуляў і, каб не згубіць твару, проста скачаў тэкст для навагодняга выступу бацькі з сайту АГП. Як можна было зрабіць галоўнай тэмай навагодняга прэзыдэнцкага віншаваньня «неабыякавасьць». Хіба ня гэта галоўны бжык апазыцыі, якая рэгулярна арганізуе «пікеты неабыякавых людзей»?

Аднак на месцы Лукашэнкі я б не сьпяшаўся аддаваць Паўлічэнку загад адкіднэпіць сьпічрайтэра-халтурщыка. Галоўнай кары заслугоўвае той, хто падбіў ППРБ прапісаць Дзеда Мароза ў Белавескай пушчы.

Пачну з таго, што афіцыйнае вызнаньне Дзеда Мароза ёсьць фактычнай капітуляцыяй перад капіталістычнай глябалізацыяй. Нагадаю, што культ Дзеда Мароза зьявіўся ў зьненавідных бацьку ЗША. Мала таго, аўтарам легенды аб Санта-Клаўсу быў лютэранскі пастар, нейкі Мур. А галоўным прамотарам дзедмарозавай гісторыі стала карпарацыя «Кока-Кола» (сталы спонсар Рэспубліканскай партыі ЗША), якая ў 1930 г. зрабіла з Санта-Клаўса галоўны брэнд сваёй рэклямнай кампаніі.

Гонар Лукашэнкі за айчыннага Дзеда Мароза падобны на гонар спажыўцоў індыйскае філіі «Макдональдзу». Пару гадоў таму яны адмовіліся есьці біг-макі, якія нібыта былі прыгатаваныя на валовым тлушчы (карова, як вядома, сакральная жывёла індуістаў). Калі ласка, сказаў дырэктарат «Макдональдзу» — і аддаў загад рабіць для індусаў біг-макі на мясцовым кашэрным прадукце. Пасьля гэтага аб'ёмы спажываньня біг-макаў на радзіме Радж Капура выраслі ў геамэтрычнай прагрэсіі.

Па-другое, культ дзеда Мароза — звычайнае паганства. Ці ведае спадар Лукашэнка, што амаль да сярэдзіны XX ст. хрысьціяне на Захадзе рабілі аўтадафэ пудзілу Санта-Клаўса, пратэстуючы такім чынам супраць моды на нэапаганства? Куды ж глядзіць наш Філарэт?

Пункт тры. Перад тым як сьвяточна абвяшчаць аб тым, што Дзед Мароз пераехаў з Ляпляндыі ў Белавежжа, я б раіў Лукашэнку зазірнуць у талмуды заходніх псыхолягаў Мартына Пэро, Вэронікі Плато-Аль, Жыльбэра Дыяткіна. Яны дасьледавалі фэномен папулярнасьці Санта-Клаўса сярод дзяцей і прыйшлі да высновы, што ноў-хаў чувака ў чырвоным балахоне — інфантыльны патэрналізм. Дзед Мароз у вачах малых — ідэальны бацька, добры і сэксуальна не заклапочаны ў адносінах да маці. Раней у Беларусі гэтую функцыю несьвядома выконваў Лукашэнка. Раскручваючы Дзеда Мароза, Рыгоравіч ахвяруе яму частку сваёй харызмы. Адзінае выйсьце для гаранта Канстытуцыі 1996 г. у такой сытуацыі — проста памяняць прозьвішча па бацьку, напрыклад на Аляксандар Марозавіч Лукашэнка. А таксама натуралізаваць у Беларусі малпу і іншых прадстаўнікоў кітайскага календара.

**Лёлік Ушкін**

Віктар Шніп



## Адвечная баляда

Яшчэ адзін, як крыж, за сьпінай год...
А ты сьляпы і цёмны, нібы крот,
І шлях твой, як краціная нара,
У цемры, дзе ідзеш безь ліхтара
Туды, дзе невядомасьць, як сьвятло,
І цемра, нібы вечнасьці крыло,
Плыве спакойна, нібы сон, над намі,
Над намі, як забытымі крыжамі...
І мы ня плачам, мы з табой ідзём,
Нібыта дым за маладым агнём,
Ідзём за цёплым подыхам вясны,
Што ўзімку нашы асьвятляе сны
І шлях наш, як краціную нару,
Якую я, як шкуру зьмей, зьдзяру
Зь сябе і выйду, як трава зь зямлі,
Пад неба, дзе мы ёсьць, як і былі,
І будзем, як мінулы дзень, як год,
Які, як попел, як на рэчцы лёд,
Нявечны, невядомы, як прастор,
Якім мы ўсе, як пыл, ляцім да зор.

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Любую дачушку** Тоню з Гомелю віншуем з 18-годзьдзем. Зычым шчасьця, здароўя, верных сяброў. Тата, мама

**Аленку Жук** вітаю ў гэтым, яшчэ старым, годзе, спадзяюся, што ты застанешся такой жа і ў новым! Эмі

**Rodnych**, siabroū i siabrovak, prosta dobrych ludziej vinšuju z Kaladami i Novym hodam! Siamiona — jašče j z našymi narodzinami! Trymajsia — «дэмбель» непазьбежны! Paūluk

**26 сьнежня** Беларусь пачала сьвяткаваць Дзень народзінаў Паліны Г. Вітаем. Браты-беларусы

**Віншуем** Паліну з Днём народзінаў. Зычым усяго найлепшага. Браты-беларусы: Зьміцер і Сяржук

**Паліну Г.** віншую з Днём народзінаў. Зычу шчасьця, удачы, незалежнасьці. Жыве Беларусь! Сяргей Г.

**Беларускія лекары**, увага! У найлепшай з вашых шэрагаў — сьвята нараджэньня. Віншуем, спн.Водзіч. Посьпехаў

**Catcherinthe Rye і Бурштынавы Кароль!** З Днём народзінаў Вас! Часьцей усьміхайцеся і сябруйце.

**Ania**, **soniejka!** Vinšyju z Kaladami i Novym hodam. Niachaj u Tvajim horadzie stanie ciaplej. Čorny Kot

**Žaūniera** sa studentam vinšyju sa śviatami. Nie sumujcie, chutka znoū budziecie razam. A.P.

### КАНТАКТЫ

**Шукаю дапамогі** ў вывучэньні латыскай мовы. Т.: 220-28-95. E-mail: stachus@tut.by. Надзея

**DVD-дыскі**. Пакуль не па-беларуску, але хутка! Кантакт: igvar@tut.by

**CD-ROM дыскі**: пакуль не па-беларуску, але хутка! Кантакт: igvar@tut.by

**Сутнасьць** угледзіш праз гэтыя словы: любоў да Радзімы, павага да мовы. Моладзевая ініцыятыва «Вока». voka@tut.by

**Вызначым** разам найлепшую беларускую песьню: www.vokamusic.by.ru

**Прадам** электрапліту «Электра-1001», б/к, вельмі танна. Т.: 231-20-51

### КНІГІ

**Прадаю частку** хатняга кнігазбору (гісторыя Беларусі, краязнаўства, мовазнаўства, мастацкая літаратура). Т.: 8-029-400-45-91 (кошт званка 147 р/хв)

**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
выпускны рэдактар — Арцём Лява
карэктар — Сяргей Петрыкевіч
карэктарка — Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар — Андрэй Чык
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.

8 палос фарматам A2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск код 764.

Наклад 3402. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 22.00 7.01.2004.

Замова № 66.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Аліне Д. з Койданава.** Ня варта бачыць абразу там, дзе яе няма. Апроч таго, варта адрозьніваць абразу ад крытыкі. Відаць, Сяржук Кут ня меней ад Вашага перажывае за беларускую справу: шкадуе, што да мерапрыемства ў Слуцку Вы ня здолелі далучыць як мага болей людзей.

**М.Л. зь Пінску.** Бясспрэчныя ісьціны сьцьвярджаецe.

**Міхалу М. З Новых Лышчыцаў.** Кнігі, пра якую просіце, на продаж ня маем. Затэлефануйце на нумар (017) 284-94-52, Вам падкажуць, дзе яе знайсьці.

**Зьмітру П. з Кастрыцы.** Рэцэнзія выйшла аднавымерная: вось часопіс, у ім такія і такія аўтары пра тое і тое пішуць. Прыкладаецца кароткі зьмест артыкулаў. Такія рэцэнзіі не дазваляюць пабачыць вартасьці выданьня. Каб Вы агледзелі «БГА» разам з «Спадчынай», «Беларускім гістарычным часопісам», «Магілёўскай даўнінай», было б весялей.

**С.Я. зь Менску.** Апавяданьні прапануйце газэце «Раніца».

**Янку Л. зь Нянькава.** Маеце выдатна распрацаваны ўрок на тэму «Жыцьцё і творчасьць Адама Міцкевіча». Але, як для газэтнай публікацыі, недастаткова інтрыгоўна.

## IN MEMORIAM

Памёр адзін з самых «таемных» беларускіх паэтаў Янка Юхнавец. Ён нарадзіўся ў Забродку (Бегамскі раён). У паэта быў трагічны лёс. Ягонага бацьку і пяць малых братоў спалілі ў вайну літоўскія нацысты… Жыў у Стэйтан-Айлендзе (ЗША), апошнія гады правёў у коме. «Дня апошняга не было…» «НН» выказвае спачуваньні ўсім, каму быў дарагі Янка Юхнавец.

**Наша Ніва** КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

**Тэкст** ______________________

**Імя і прозьвішча** ______________________

**Адрас, тэлефон** ______________________